М. В. Альфер
А. П. Сафонава

Беларуская мова 3

Частка 1

М. В. Альфер
А. П. Сафонава

Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для 3 класа спецыяльных агульнаадукацыйных школ з беларускай мовай навучання

У 2 частках

Частка 1

Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь

2-е выданне, перапрацаванае

Мінск «Народная асвета» 2011

Правообладатель Народная асвета

УДК 811.161.3(075.2=161.3)-056.313
ББК 81.2Беи-922
А59

Рэцэнзенты:

кафедра беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (кандыдат філалагічных навук, дацэнт *А. Г. Міхалевіч*); настаўнік пачатковых класаў першай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Навагрудская спецыяльная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення» *Н. М. Гасціла*

Умоўныя абазначэнні:

дамашняе заданне

правіла

развіццё звязнага маўлення

пытанні і заданні

слоўнік

● спрошчанае заданне

● абавязковае заданне

● заданне павышанай складанасці

вучыцеся гаварыць хутка

вучыцеся весці размову

Альфер, М. В.

А59 Беларуская мова : вучэб. дапам. для 3-га кл. спец. агульнаадукац. шк. з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 1 / М. В. Альфер, А. П. Сафонава. — 2-е выд., перапрац. — Мінск : Нар. асвета, 2011. — 135 с. : іл.

ISBN 978-985-03-1503-8.

Вучэбны дапаможнік для 3-га класа спецыяльных агульнаадукацыйных школ для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення, для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні з беларускай мовай навучання.

УДК 811.161.3(075.2=161.3)-056.313
ББК 81.2Беи-922

ISBN 978-985-03-1503-8 (ч. 1)
ISBN 978-985-03-1505-2

© Альфер М. В., Сафонава А. П., 2000
© Альфер М. В., Сафонава А. П., 2011, са змяненнямі
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2011

Правообладатель Народная асвета

Паўтарэнне

1

1. Разгледзьце малюнак. Складзіце па ім сказы (*вусна*). Выкарыстайце слоўнікавыя словы.

ве́расень **Дзень ве́даў** **Белару́сь**

2. Прачытайце верш.

Дзень святочны, дзень вясёлы.
Пахнуць яблыкі ў садах.
Мы ідзём сягоння ў школу,
ранцы новыя ў руках.

Правообладатель Народная асвета

Мы настаўніцу вітаем,
ад усмешак светлы клас.
Нават восень залатая
вельмі просіцца да нас. *М. Пазнякоў.*

Якое свята 1 верасня?
Назавіце гукі ў словах *пахнуць, просіцца, настаўніцу*.
Колькі гукаў у кожным слове? Колькі літар?
Вусна апішыце малюнкі, якія можна было б зрабіць да верша.

Гукі мы чуем і вымаўляем.
Літары мы бачым і пішам.

3. Прачытайце верш. Вывучыце яго на памяць.

Мова мая!
Ты — як хлеб святы.
Святою
І будзеш заўсёды. *Т. Мельчанка.*

З чым параўноўваецца родная мова?
Колькі гукаў і колькі літар у слове *мова*?
Запішыце верш па памяці. Праверце па падручніку.

4. Складзіце з літар словы.

А, ч, н, й, а, ы
к, а, і, р, н, а
э, с, п, у, б, р, і, л, к, а

Правообладатель Народная асвета

Р, дз, м, а, і, а
е, л, Б, а, р, ь, с, у

Колькі літар і колькі гукаў у словах *Айчына, Радзіма*?

5. Разгледзьце малюнак. Раскажыце, што вы на ім бачыце.

Пагутарым. Чым багаты родны край?

6. Прачытайце. Дапішыце сказы па ўзоры.

Узор. *Я люблю слухаць беларускую калыханку.*

Правообладатель Народная асвета

Я люблю ... .
Я люблю ... .
Я люблю ... .
Я люблю ... .
Я люблю ... .

2

1. Прачытайце прыказкі і растлумачце іх сэнс.

Прыемнае слова — вясенні дзень.
Словам працы не заменіш.
Дзе няма ахвоты, там няма работы.

Спішыце адну прыказку (*на выбар*).

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі.

Галосных гукаў у беларускай мове шэсць: **[а], [о], [у], [э], [ы], [і].** На пісьме яны абазначаюцца літарамі: **а, о, у, э, ы, і, е, ё, ю, я.** Галосных літар дзесяць.

2. Устаўце прапушчаныя галосныя літары, каб атрымаліся розныя па значэнні словы. Запішыце пары слоў па ўзоры.

Узор: *сы́н — со́н.*

с.н — с.н, к.т — к.т, л.с — л.с, д.м — д.м, м.ч — м.ч, н.с — н.с, с.к — с.к, в.з — в.з

Падкрэсліце літары, якімі адрозніваюцца словы.

Правообладатель Народная асвета

3. Разгледзьце малюнкі. Прачытайце іх назвы. Выпраўце памылкі.

ком рака вада жар коцік

Запішыце словы парамі па ўзоры. Падкрэсліце літары, якімі адрозніваюцца словы.

Узор: *кот* — *кош*.

Зычныя гукі абазначаюцца літарамі: **б, в, г, д, ж, з, й, к, л, м, н, п, р, с, т, ў, ф, х, ц, ч, ш.**

Гукі **[дж], [дз]** на пісьме абазначаюцца дзвюма літарамі: **дз, дж.**

4. Прачытайце словы.

гадзіннік, дажджы, дзівак, дзіця, дзядзька, джэм, саджанцы, ураджай

Запішыце словы ў два слупкі. Пакрэсліце літары **дж, дз**.

Узор: ***дж*** ***дз***
дажджы *дзівак*

Правообладатель Народная асвета

гадзі́ннік **джы́нсы** **джэ́мпер** **дзя́куй**

Якога чалавека можна назваць дзіваком?
Вусна складзіце сказы са словам *дзівак*.

5. Прачытайце словы. Аб'яднайце іх у групы.

дзік, джынсы, чацвер, добры дзень, зубр, джэмпер, паліто, дзякуй, панядзелак, мядзведзь, калі ласка, нядзеля

Запішыце групы слоў па ўзоры. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зычныя гукі.

Узор. *Добры дзень, калі ласка, дзякуй — ветлівыя словы.*

3

1. Успомніце, у якім парадку размяшчаюцца літары ў алфавіце.

Аа Бб Вв . . Ее Ёё
. Зз Іі . . Лл Мм . .
Пп . . . . . .
ы ь Ээ Юю Яя

Запішыце ўсе літары алфавіта.

Правообладатель Народная асвета

2. Выпішыце першую літару кожнага слова. Прачытайце слова, якое ў вас атрымалася. Запішыце яго.

антонаўка, ласі, фіялка, агуркі, восень, івалга, трактар

3. Прачытайце словы.

ячмень, памідоры, пшаніца, морква, цыбуля, жыта, бурак, авёс, капуста

Напішыце ў алфавітным парадку назвы збожжа і агародніны па ўзорыы.

Збожжа: *авёс*, ...
Агародніна: *агуркі*, ...

4. Прачытайце назвы еўрапейскіх краін і іх сталіц.

Беларусь	Варшава
Расія	Вільнюс
Украіна	Мінск
Польшча	Масква
Літва	Кіеў

- Спішыце. Запомніце іх.
- Запішыце назвы еўрапейскіх краін у алфавітным парадку, а потым іх сталіц.
- Запішыце словы парамі.

Узор: *Беларусь — Мінск.*

Правообладатель Народная асвета

5. Літары ў назвах мэблі пераблыталі свае месцы. Расстаўце літары ў правільным парадку.

ф, а, ш, а — т, а, т, х, а
а, н, к, а, п, а — э, с, к, а, р, л
о, т, л, с — ж, о, а, к, л

Запішыце словы ў алфавітным парадку.

4

1. Выразна прачытайце словы. Якімі гукамі яны адрозніваюцца? Якія з гэтых гукаў звонкія, а якія глухія? Складзіце і запішыце сказы са словамі любой пары.

дом — том, дзень — цень, жыць — шыць, бот — пот, зала — сала, год — ход, Джэк — чэк, біў — піў, зіма — Сіма

Звонкія зычныя гукі: **[б], [б’], [в], [в’], [г], [г’], [д], [дз’], [дж], [ж], [з], [з’], [й], [л], [л’], [м], [м’], [н], [н’], [р], [ў].**

Глухія зычныя гукі: **[к], [к’], [п], [п’], [с], [с’], [т], [ф], [ф’], [х], [х’], [ц], [ц’], [ч], [ш].**

Зычныя гукі **[б — п], [г — х], [д — т], [дж — ч], [дз — ц], [з — с], [б’ — п’], [г’ — х’], [з’ — с’]** утвараюць пары па звонкасці і глухасці.

2. Прачытайце сказы. Выпраўце памылкі.

У Зіны забалеў **суп.** Бабуля зварыла смачны **зуб.** Без вады нельга **шыць.** Я ўмею **жыць**

Правообладатель Народная асвета

адзенне ляльцы. Цэлы **цень** шукае гультай **дзень.**

Запішыце сказы правільна. Падкрэсліце парныя звонкія і глухія зычныя ў выдзеленых словах.

3. Прачытайце словы.

бабёр, барабан, горад, жаба, журавель, муравей, ступа, тата, хата, шапка, шашкі, шпак

Выпішыце словы па ўзоры. Спачатку тыя, у якіх усе зычныя гукі звонкія, а потым — у якіх усе зычныя гукі глухія. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зычныя гукі.

Узор: *барабан*, ..., ..., ...
шапка, ..., ..., ...

Каб праверыць напісанне парных звонкіх і глухіх зычных на канцы і ў сярэдзіне слова, трэба так змяніць слова, каб пасля зычнага стаяў галосны: *дуб — дубы, плот — платы, сцежка — сцежачка.*

4. Змяніце словы так, каб пасля зычнага на канцы слоў стаяў галосны. Запішыце. Падкрэсліце зычныя, напісанне якіх вы правяралі.

Узор: *голас — галасы.*

брат — ..., колас — ..., сноп — ..., мёд — ..., дождж — ..., грыб — ..., гарбуз — ...

Правообладатель Народная асвета

5. Прачытайце тэкст **«Восень»**.

Ні.кія хмары плывуць па небе. Цэлы дзень ідзе дож.. . На вуліцы лужы. З поля даўно сабралі хле. і бульбу. Хутка пачнуцца замара.кі. Усе рыхтуюцца да ця.кай зімы.

Устаўце прапушчаныя літары. Вусна падбярыце праверачныя словы. Спішыце.

Пагутарым. Ці падабаецца вам восень? Чаму?

5

1. Прачытайце. У кожны сказ устаўце патрэбнае па сэнсе слова.

У Беларусі вялікія ... .
У гэтых лясах водзяцца ... .

Выкарыстайце словы: *ласі, лясы*.

Падкрэсліце літары, якімі адрозніваюцца гэтыя словы. Якімі гукамі яны адрозніваюцца?

2. Прачытайце. Устаўце патрэбныя літары. Спішыце.

— Каб не было на свеце **ы**, —
сказалі хорам **м.шкі**, —
былі б мядзведзямі ўсе мы,
нас дзеці звалі б — **м.шкі**.

Якімі гукамі адрозніваюцца выдзеленыя словы? Вусна складзіце сказы з гэтымі словамі.

Правообладатель Народная асвета

3. Прачытайце. Змяніце словы па ўзоры.

коні — конь карасі — ...
ласі — ... акуні — ...
алені — ... ліні — ...

Запішыце. Падкрэсліце **ь** і зычную перад ім. Як вымаўляюцца гэтыя зычныя?

Пасля цвёрдых зычных пішуцца галосныя **а, о, ы, у, э.**
Пасля мяккіх зычных пішуцца галосныя **я, ё, і, ю, е** і літара **ь.**

4. Прачытайце. Складзіце са слоў сказы. Запішыце сказы. Падкрэсліце склады з літарамі, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі. Прыдумайце загаловак тэксту.

летам, жыве, вёсцы, у, Вася
любіць, і, лес, раку, ён
збірае, і, грыбы, ягады, у, лесе, Вася
раку, на, ходзіць, купацца, лавіць, і, рыбу
у, хораша, вёсцы, летам

Пагутарым. Раскажыце, як вы праводзіце лета.

5. Прачытайце. Устаўце літары, якія абазначаюць мяккасць папярэдніх зычных. Запішыце.

саджу — с.джу лаг.р кашул.
журав.л. студз.н. м.ска
сн.жан. б.роза санк.

Правообладатель Народная асвета

1. Прачытайце словы парамі. Параўнайце вымаўленне выдзеленых зычных.

школа — школьнік
пісаць — пісьмо

Складзіце з гэтымі словамі сказы. Запішыце іх.

2. Прачытайце словы.

Алеся, бяліць, дождж, лялькі, пчала, Саша, сядзець, чабор

Выпішыце спачатку словы, у якіх усе зычныя цвёрдыя, а потым — у якіх усе зычныя мяккія.

3. Разгледзьце малюнкі.

Запішыце назвы лясных жыхароў.

Хто тут «лішні»?

Назавіце ў словах спачатку ўсе цвёрдыя гукі, а потым — усе мяккія.

Складзіце вусна сказы з гэтымі словамі.

Пагутарым. Якіх лясных жыхароў вы бачылі?

Праверце сябе: **дзя́цел, зязю́ля, саро́ка, дзік.**

Правообладатель Народная асвета

4. Складзіце словазлучэнні.

родная, бацькоўская	*край*
роднае, вечнае	*мова*
родны, беларускі	*слова*

Запішыце словазлучэнні.

Колькі гукаў і колькі літар у словах *край, слова*?

Вусна складзіце сказы з атрыманымі словазлучэннямі.

5. Прачытайце загадкі і адгадайце іх.

1) Твой **с.бар** блізкі: сядз.ць — **высокі**, а ўстане — нізкі.

2) З людз.мі с.бруе, хату вартуе, ж.ве пад ганкам, хвост абаранкам.

Устаўце прапушчаныя літары. Растлумачце іх правапіс. Спішыце.

Назавіце ў выдзеленых словах спачатку ўсе цвёрдыя гукі, а потым усе мяккія.

6. Разгледзьце малюнак. Апішыце сябра Міколы.

Пачніце так:

У Міколы ёсць верны сябар. Яго завуць ... .

Запішыце апавяданне.

Правообладатель Народная асвета

1. Прачытайце. Размясціце сказы так, каб атрымаўся тэкст. Прыдумайце загаловак.

Хлопчыкі кладуць соль на камень. Ім патрэбна і соль. Лось вельмі прыгожы. Ласі кормяцца галінкамі дрэў і травой. Настаўнік даў параду насіць у лес соль. Ласі часта прыходзяць лізаць соль. У нашых лясах жывуць ласі.

Разгледзьце малюнак і адкажыце на пытанні.



Хто жыве ў нашых лясах?
Чым кормяцца ласі?

Правообладатель Народная асвета

Ад каго хлопчыкі даведаліся, што ласям патрэбна соль?
Навошта ласі прыходзяць да каменя?
Вусна перакажыце тэкст.
Пераказ запішыце ў сшыткі.

1. Прачытайце. **8**

алень, бусел, верасень, дзяцел, журавель, клён, конь, корань, лес, лось, снежань, ясень

Выпішыце словы з мяккім зычным на канцы.
Складзіце сказ са словам *верасень*. Запішыце.

журавéль **чмель** **пластмáса**

2. Прачытайце. Назавіце спачатку словы, у якіх тры гукі, а потым — словы, у якіх чатыры гукі. Выпішыце словы, у якіх літар больш, чым гукаў.

дом, дзень, дзік, кот, пень, рыба, сталь, стол, чмель

3. Прачытайце. Выпішыце ў адзін слупок словы, якія называюць «*смачныя*» і «*прыемныя*» рэчы, а ў другі — словы, якія называюць «*непрыемныя*» рэчы.

баль, боязь, карамель, карусель, кашаль, мазоль, міндаль

Падкрэсліце **ь** разам з папярэдняй літарай.
Складзіце з любым «*прыемным*» словам сказ і запішыце.

Правообладатель Народная асвета

4. Прачытайце жартоўны верш.

Тата азбуку купіў —
літары з пластмасы.
Словы розныя складаць
Натка ўзялася.

Першакласніца-сястра
хутка навучыла,
і складаюць на стале:
МАМА, РАМА, МЫЛА...

Натка, гляньце, і сама
ДЗЕН, АЛЕН складае.
Толькі хмурыцца яна —
мяккі знак шукае.

Літару бярэ адну,
потым і другую.
А ці мяккая яна,
на зубок спрабуе.

П. Прануза.

Хто навучыў Натку складаць першыя словы?
Што не зразумела малая Натка?
Запішыце правільна словы, якія складала Натка.

5. Прачытайце. Дайце тэксту загаловак.

Алені — гэта вялікая група жывёл. Далёка ў халоднай тундры жыве паўночны алень. У сібірскай тайзе — ягоны сваяк, які завецца ма-

Правообладатель Народная асвета

рал. У лясах Еўропы сустракаюцца алень, казуля, лось, лань.

Выпішыце з тэксту назвы жывёл. Падкрэсліце словы з **ь**.

9

1. Прачытайце.

а) чырвоны	апельсін
густы	школьнік
салодкі	цюльпан
старанны	ельнік
б) новая	бульба
горкая	лялька
смажаная	вольха
высокая	рэдзька

Падбярыце да слоў з правага слупка словы з левага, якія падыходзяць па сэнсе. Запішыце спалучэнні слоў.

Назавіце ў словах мяккія зычныя і адкажыце, як на пісьме абазначана іх мяккасць.

2. Прачытайце і адгадайце загадкі.

1) Маленькі, кругленькі,
а за хвост не паднімеш.

2) Шустранькі звярок скача
з елкі на дубок.

Спішыце. Падкрэсліце зычныя літары разам з **ь**.

Правообладатель Народная асвета

3. Прачытайце. Дайце тэксту загаловак.

У лесе расла дзічка. Густы ел.нік зацяняў яе ад сонца. Ствол у дзічкі быў тонен.кі. Вучні выкапалі мален.кае кволен.кае дрэўца і пасадзілі каля школы. З яго вырасла прыгожан.кая яблын.ка.

Спішыце, устаўляючы ў словах прапушчаную літару.

4. Прачытайце. Устаўце літару **ь**, дзе трэба. Запішыце.

Вугал., гус., дзен., журавел., кон., коран., лагер., лебедз., лос., печ., слесар. .

Бул.ба, белен.кі, дзядз.ка, звон.кі, кан.кі, мален.кі, піс.мо, рэдз.ка, школ.нік.

5. Прачытайце. Якія галосныя гукі вы сустрэлі ў прыказках? Выпішыце іх.

Хто за Радзіму гарой, той сапраўдны герой.
З малых крыніц вялікая рака нараджаецца.
Розум — найлепшае багацце.

10

1. Прачытайце. Спішыце з падзелам слоў для пераносу.

бульба, дзянькі, яблынька, навальніца, бацькі, пальцы, халадзільнік

Колькі гукаў і літар у слове *пальцы*?
Чаму літар больш, чым гукаў?

Правообладатель Народная асвета

Пры пераносе слоў літара **ь** не аддзяляецца ад папярэдняй зычнай: *воль-ха, дзянь-кі.*

2. Прачытайце.

Марылька прыехала ў вёску да бабулькі. У бабулі ўтульная хата. Усюды вісяць ільняныя ручнікі. Нават лялька зроблена з ільняной кудзелі.

Спішыце. Падзяліце словы з **ь** для пераносу.

3. Прачытайце словы.

кропелька	агеньчык	песенька
васількі	ельнік	дзядзька

Падзяліце словы для пераносу. Запішыце словы.

4. Падбярыце і запішыце 5-6 слоў з **ь** у сярэдзіне. Падзяліце іх для пераносу.

5. Прачытайце смяшынкі.

Мама расказвае маленькаму Славіку казку:

— І вось Папялушка ў сваіх крыштальных туфліках села ў карэту і паехала на баль.

Славік зацікаўлена пытаецца:

— А хто руль круціў?

Правообладатель Народная асвета

* * *

Мама пытаецца ў Міхаські:

— Сынулька, табе што, новенькія боцікі цесныя?

— Не, я толькі пальцы зажмурыў.

Назавіце словы з **ь** у канцы і ў сярэдзіне слова. Выпішыце іх з падзелам для пераносу.

чацве́р **шэ́ры** **шэ́рань**

11

1. Прачытайце словы.

ажына, грыбы, дождж, жолуд, жоўты, ночы, парашут, чужы, шышка

Спішыце. Падкрэсліце літары **ж, дж, ч, ш, р.** Як яны вымаўляюцца?

2. Прачытайце. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Спішыце.

У лесе дзеці збіралі ... і ... .

Вавёрка запасае на зіму ... і ... .

Маленькі ... схаваўся пад кустом.

На полі спее ... і ... .

Правообладатель Народная асвета

Падкрэсліце літары **ж**, **ш**, **р**, **ч**. Як яны вымаўляюцца?

Якія галосныя пішуцца пасля **ж, ш, р, ч**?

Зычныя **[ж], [дж], [р], [ч], [ш]** заўсёды вымаўляюцца цвёрда. Пасля іх пішуцца галосныя **а, о, у, э, ы**: ***вожык, дажджы, чацвер, шэрань***.

Зычны **[дз']** вымаўляецца мякка. Пасля **дз** пішуцца **е, ё, ю, я, і, ь**: ***дзюба, дзяцел, мядзведзь***.

3. Прачытайце словы.

шэры	лісічка
шустры	зайчык
рыжая	верабейчык
смачны	памідор
чырвоны	джэм

Падбярыце да слоў з левага слупка словы з правага, якія падыходзяць па сэнсе. Запішыце і падкрэсліце літары **ж, ч, ш, р, дж** разам з наступнымі галоснымі.

З якіх ягад самы смачны джэм?

4. Прачытайце словы. Устаўце пасля зычных **[ж], [дж], [р], [ч], [ш]** патрэбныя галосныя. Запішыце.

вож.к, вуш., грош., др.ва, ж.равіны, крыж.дзюб, руч.й, Р.спубліка, сініц., тр.мвай, урадж.й, ч.цвер, ч.рны, ч.жы

Правообладатель Народная асвета

5. Разгледзьце малюнак. Назавіце намаляваныя прадметы.

Запішыце назвы пачастункаў, якія вы паставіце на стол у свой дзень нараджэння для гасцей. У словах падкрэсліце літары **ж, ч, ш, р, дж** разам з наступнымі галоснымі.

Пагутарым. Раскажыце, якія пачастункі былі ў вашага сябра ў дзень нараджэння. Якія з іх вам больш за ўсё спадабаліся?

Правообладатель Народная асвета

1. Разгледзьце малюнак.

Дзе былі дзеці?
Што рабілі хлопчыкі і дзяўчынкі ў парку?
У якія гульні гулялі дзеці?
У якія гульні любіце гуляць вы?

Запішыце адказы на пытанні з дапамогай малюнкаў.
Назавіце словы з мяккімі зычнымі.

Правообладатель Народная асвета

2. Прачытайце. У кожным радку адшукайце «лішняе» слова.

Яблыкі, грушы, слівы, жасмін.
Жыта, журавіны, грэчка, пшаніца.
Агрэст, ячмень, чарніцы, парэчкі.

Складзіце і запішыце тры сказы з любым з гэтых слоў (*на выбар*).

Назавіце зычныя, якія заўсёды цвёрдыя.

3. Прачытайце. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Запішыце.

... растуць на балоце.
Восенню ідзе халодны ... .
Зімой на дрэвах бывае ... .
Пасля серады бывае ... .

Выкарыстайце словы: *шэрань, чацвер, журавіны, дождж.*

Колькі літар і колькі гукаў у словах *шэрань, дождж*?

4. Прачытайце. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Запішыце сказы.

У Алёшы дзень ... .
Сябры павіншавалі ... .
Яны падарылі яму ...,
..., ..., ...

Правообладатель Народная асвета

Назавіце спачатку словы, у якіх усе зычныя мяккія, а потым словы, у якіх усе зычныя цвёрдыя.

Пагутарым. Якія падарункі вы хацелі б атрымаць у дзень нараджэння?

5. Прачытайце пытанні. Вусна адкажыце на іх. Запішыце адказы.

Якое сёння надвор'е?
Якое надвор'е было ўчора?
Якая пара года цяпер?
Які сёння дзень тыдня?
Назавіце спачатку зычныя, якія заўсёды цвёрдыя, а потым зычныя, якія заўсёды мяккія.

13

1. Прачытайце.

дож..ык, ..ядуля, Ра..іма, рэ..ька, ура..ай, ..ень, сту..ень

Якія гукі на пісьме абазначаны дзвюма літарамі? Устаўце прапушчаныя літары. Запішыце словы.

2. Прачытайце.

джэм, ледзянец, торт, цукерка, шакалад, дзяжурны, рэдзька

Назавіце ў гэтых словах зычныя гукі. Якія гукі абазначаны дзвюма літарамі?

Запішыце з падзелам слоў для пераносу.

Правообладатель Народная асвета

3. Прачытайце верш. З чым параўноўваецца аблачынка? На што падобна аблачынка?

На парахо..ік.
На ..яўчынку.
На куст чаромхі.
На слана.
Падобна на крыло яна!

Г. Каржанеўская.

Выпішыце словы, у якіх прапушчаны літары. Якія гукі яны абазначаюць?

Пры пераносе слоў **дз, дж** не раздзяляюцца: *сту-**дзень**, са-**джу**, са-**джанцы**.*

4. Прачытайце і адгадайце загадку. Запішыце загадку разам з адгадкай, падзяляючы словы для пераносу.

Усіх буджу, хоць без гадзінніка хаджу.

5. Прачытайце заклічку.

Зранку цэлы дзень
дождж на вуліцы ідзе.
Дождж руплівы, палівай,
слаўны вырасце ўраджай! *М. Пазнякоў.*

А ці ведаеце вы яшчэ якія-небудзь заклічкі? Спішыце, падзяляючы словы для пераносу.

Правообладатель Народная асвета

1. Прачытайце словы.

дзеці, цацка, цецярук, цётка, Цімох, цішыня, цукар, цыбуля, цыркуль, цэгла, цюльпан

Спішыце. Падкрэсліце **ц** разам з наступнай літарай. Як яны вымаўляюцца?

2. Прачытайце сказы.

Раніцай снедаюць.
У абед абедаюць.
Увечары вячэраюць.

Спішыце. Падкрэсліце **ц** разам з наступнай літарай. Як яны вымаўляюцца?

Пагутарым. Раскажыце сябру (сяброўцы), што вы елі раніцай. У абед? Вечарам?

Гук **[ц]** бывае цвёрдым: ***цацка, цэгла, маладзец*** і мяккім: ***цёпла, ціха, ідуць.***

3. Прачытайце. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Запішыце сказы. Назавіце словы з гукам **[ц’]**.

У спальні ... . У сталовай ... . На спартыўнай пляцоўцы ... .

Выкарыстайце словы: *ядуць, бегаюць, спяць.*

Правообладатель Народная асвета

4. Прачытайце верш. Спішыце. Назавіце словы з гукам **[ц’]**.

З неба льецца дождж зялёны —
зелянеюць вербы, клёны.
Ходзіць дожджык залаты —
спеюць жоўтыя жыты. *А. Пысін.*

клён **вярба́** **зелянéць** **зялёны**

5. Прачытайце тэкст. Прыдумайце загаловак.

Хораша ў лесе восенню. Ціха і спакойна стаяць хвоі. Зрэдку ў хвойніку сустрэнеш жоўтую бярозку і чырвоную асінку. Апалае бярозавае і асінавае лісце здаецца шляпкамі маладзенькіх грыбкоў. Сагнешся за такім грыбам, а там — лісцікі.

Спішыце. Падкрэсліце словы, у якіх літара **ц** абазначае гук **[ц’]**.

15

1. Прачытайце словы. Спішыце. Пастаўце націск.

жолуд	жалуды
горы	гара
стрэхі	страха
цэны	цана

Якія галосныя гукі чуюцца і якія літары пішуцца пад націскам у словах першага слупка?
Якая літара пішацца замест **о, э** не пад націскам?

Правообладатель Народная асвета

2. Прачытайце. Змяніце словы па ўзорыі.

Узор: *бор — бары, росы — раса, цэгла — цагляны.*

стог — ... сосны — ... шэрсць — ...
сноп — ... ногі — ... дрэва — ...

Запішыце словы парамі. Пастаўце націск. Са словамі апошняга слупка вусна складзіце сказы.

3. Прачытайце. Устаўце літары **о** ці **а**. Запішыце.

Бабуліны казкі

У бабулі м.ёй рукі л.ўкія,
у бабулі м.ёй песні д.ўгія.
Разматае клубок з новай казкаю,
прыйдзе хітры к.ток, трэцца з ласкаю.

В. Вярба.

4. Прачытайце. Словы ў дужках пастаўце ў патрэбнай форме. Запішыце сказы, апускаючы дужкі.

(*Сасна*) растуць на сухім, пясчаным месцы. У (*бор*) звычайна светла і суха. Зрэдку звіняць птушыныя (*голас*). (*Ствол*) сосен ідуць на дошкі і на мэблю. Сасновыя (*бор*) багатыя на чарніцы і брусніцы.

Пагутарым. Ці ведаеце вы яшчэ што-небудзь пра сасновы бор?

Якія звяры і птушкі там жывуць? Раскажыце.

Правообладатель Народная асвета

5. Прачытайце. Замест кропак устаўце прапушчаныя літары. Спішыце.

Ярка свеціць с.нца. Вось р.чка і г.рка. Тут мн.га дзяцей. Вакол г.ман і смех. Весела дзецям на г.рцы. Непадалёку стаіць ш.ры лес.

Пастаўце націск у словах з устаўленымі літарамі.

Які настрой выклікалі ў вас запісаныя сказы? Адшукайце словы, якія дапамагаюць стварыць такі настрой.

16

1. Прачытайце словы парамі.

дзень — дзянёк лёд — лядок
зелень — зялёны клён — кляновы

Спішыце, пастаўце націск. Падкрэсліце першы склад перад націскам.

Якая літара пішацца замест **е, ё** ў першым складзе перад націскам?

2. Прачытайце вясёлыя небыліцы.

Пчолы спяць зіму ў **бярлозе,**
а **мядзведзі** — у вуллі.
Конь **спявае** на бярозе,
вераб'я ў плуг запраглі.
Сена з лугу прыляцела
і ў **хляве** карову з'ела. *М. Пазнякоў.*

Правообладатель Народная асвета

Выпішыце выдзеленыя словы. Пастаўце ў іх націск. Падкрэсліце склад з літарай **я**.

3. Запішыце словы, устаўляючы патрэбныя літары. Пастаўце ў словах націск.

след — сл.ды	сцены — сц.на
белы — б.лёны	гнёзды — гн.здо
бег — б.гуць	зелень — з.лёны
вёслы — в.сло	вецер — в.тры

4. Прачытайце. Складзіце са слоў сказы. Запішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.

у, б.роза, парку, высокая, расце
в.дзе, вузкая, да, сц.жынка, яе
для, б.розе, на, вісіць, птушак, кармушка
часта, прыходзяць, сюды, дз.ці
да, птушкі, дз.цей, прывыклі

Дайце загаловак тэксту. Вусна прадоўжыце тэкст.

Пагутарым. Ці ведаеце вы, якія птушкі прылятаюць да кармушкі?
А якія птушкі прылятаюць да вашай кармушкі?

5. Прачытайце прыказкі. Устаўце прапушчаныя літары і растлумачце іх напісанне. Спішыце.

Ад ляноты чакай б.доты.
В.сной пасееш — увосень зб.рэш.

Правообладатель Народная асвета

Родная з.мля м.кчэйшая за чужую п.рыну.

Пастаўце націск у словах з устаўленымі літарамі. Растлумачце сэнс прыказак.

17

Пераносіць словы з аднаго радка на другі трэба па складах: *ма-лі-ны, су-ні-цы, чар-ні-цы.*

1. Прачытайце. Спішыце словы, падзяляючы іх для пераносу.

Ластаўка, воўк, верабейка, выдра, зайчык, малінаўка, грак, вожык, шпак, аўсянка, рысь, голуб.

Якія словы нельга падзяліць на склады? Пастаўце націск у словах.

Склад з адной літары нельга пакідаць на радку ці пераносіць на другі радок. Пераносіць трэба так: *ало-вак, асі-на.*

2. Прачытайце словы. Выдзяляйце голасам націскны склад. Выпішыце спачатку словы з націскам на першым складзе, а потым — на другім.

мяса, масла, крупы, пірог, кампот, бульба, цукар, кісель, рыба

Вусна складзіце з гэтымі словамі невялікае апавяданне на тэму «**Абед**».

Правообладатель Народная асвета

3. Прачытайце. Спішыце. У словах першага сказа пастаўце націск.

Зямля доўга ляжала голая, скамянелая ад марозу. А потым адной ноччу пайшоў снег. Ён укрыў усё белай коўдрай (*В. Хомчанка*).

Падкрэсліце зычныя гукі ў слове *коўдрай*.

Выпішыце словы, якія нельга падзяліць для пераносу.

4. Прачытайце скорагаворкі.

У Ларысы і **Валеры** на ліпе **арэлі.**
Сеў Рому на **тварык** камарык,
злавіў камарыка Рома на тварыку.

Выдзеленыя словы выпішыце і падзяліце для пераносу.

5. Прачытайце верш. Што абазначае слова *«Айчына»*? Якое іншае слова мае такое ж значэнне?

Мая Айчына —
поле, нівы,
над Нёманам зялёны гай,
прыгожы Брэст і Мінск шумлівы —
уся Беларусь ад краю ў край. *П. Броўка.*

Выпішыце словы, якія нельга падзяліць для пераносу.

Правообладатель Народная асвета

1. Разгледзьце малюнкі.

Якія прадметы вы бачыце на малюнках?
Якія дзеянні паказаны на малюнках?
Пра што або пра каго можна скласці сказы?

Складзіце і запішыце сказы па ўзоры.

Узор. *Дзяўчынка корміць коціка.*

Правообладатель Народная асвета

малі́на **гру́ша** **я́блык** **дзяду́ля**

2. Прачытайце тэкст. Спішыце, устаўляючы ў сказы патрэбныя словы.

Лясны доктар

На ўскрайку лесу расце ... груша. Прыляцела на грушу ... птушка. Гэта быў дзяцел. ... дзюбай ён стукаў па дрэве. Хутка ў ствале з'явілася ... . вылечыў хворае дрэва.

Выкарыстайце словы: *старая, вострай, прыгожая, дупло, дзяцел.*

Колькі сказаў у тэксце?
Пра што або пра каго гаворыцца ў кожным сказе?
Ці бачылі вы дзятла? Як ён выглядае?

Словы ў сказе звязаны паміж сабой па сэнсе і стаяць у пэўным парадку. **Сказ** — гэта слова або некалькі слоў, якія выражаюць закончаную думку.

3. Прачытайце. Запішыце сказы. Падкрэсліце групы слоў, якія не складаюць сказаў.

На лесвіцы скуголіла маленькае шчаня.
Вожык свеціць холадна ў вадзе.
Старэйшы брат падарыў Паўліку сапраўдны палявы бінокль.
Вочы драўляны ляціць маленькая дуб.

Правообладатель Народная асвета

4. Прачытайце. Дапоўніце сказы.

Дождж ... . Хмары плывуць ... . Вецер дзьме ... . Ападае лісце ... .

Запішыце атрыманыя сказы. Колькі слоў у кожным з іх?

5. Прачытайце. Складзіце сказы са слоў кожнага радка. Запішыце. Колькі сказаў атрымалася?

Яблынька

яблыньку, пасадзіў, дзед
вялікая, яблынька, вырасце
ёй, на, яблыкі, паспеюць
унукі, успамінаць, яблыкамі, дзеда, частавацца, і, будуць

Пагутарым. Якімі словамі будуць успамінаць дзеда ўнукі?

19

1. Прачытайце. Запішыце сказы ў такім парадку, каб атрымалася апавяданне.

Грыб

Наташа паставіла кошык каля баравіка і пайшла па Кастуся.

На высокай сасне сядзела вавёрка і трымала ў лапках Наташын баравік.

Раніцай Кастусь з сястрычкай Наташай пайшлі па грыбы.

Правообладатель Народная асвета

Куды знік грыб?
Хутка Наташа прывяла брата да кошыка.
Нечакана Наташа ўбачыла баравік.
Але ён не ішоў.
Ён быў вельмі прыгожы.
Дзяўчынка паклікала брата.

2. Прачытайце загадку. Адгадайце яе. Спішыце.

Нага без чаравіка,
а капялюш без галавы.

Са словам-адгадкай вусна складзіце сказ.

баравік	**чаравік**	**грыб**
баравікóвы	**чаравічны**	**грыбны́**

20

1. Прачытайце. Запішыце тэкст пад дыктоўку.

Школьны агарод

Пры школе ёсць агарод. Дзеці самі яго даглядаюць. З зямлі лезе рэпка. Белымі кветкамі зацвітае бульба. Чырванеюць памідоры. Паміж градкамі жаўцеюць гарбузы. Растуць тут цыбуля, морква, буракі, капуста. Адным словам — усяго хапае.

2. Прачытайце загадкі. Адгадайце іх.

1) Круглае, ды не гарбуз,
з хвастом, ды не мыш.

Правообладатель Народная асвета

2) Хвосцік зялёны,
галоўка чырвоная,
сяджу ў зямліцы
побач з сястрыцай.

Са словамі-адгадкамі складзіце сказы і запішыце іх.

3. Прачытайце словы. Палічыце склады ў словах. Запішыце, ставячы ў дужках колькасць складоў.

Ста-рэй-шы (3), вышэйшы ( ), глыбейшы ( ), прыгажэйшы ( ), аднойчы ( ), канарэйка ( ), сонейка ( ), зайчык ( ), чайнік ( ), майка ( ), хвойка ( ), сойка ( ), дайце ( ), падайце ( ), прыйшла ( ), спяшайся ( ), пайду ( ), тралейбус ( ).

4. Прачытайце прымаўку і прыказку. Запішыце.

Слова даражэйшае за золата.
Слова не верабей: выпусціш — не зловіш.

Адной рыскай падкрэсліце літары, якія абазначаюць звонкія гукі. Дзвюма рыскамі — якія абазначаюць парныя гукі.

5. Устаўце літары **дж**, **дз** у словы. Запішыце.

Дож.., мола..ь, поў..ень, ..яўчынка, ура..ай, на агаро..е, гля..іць, Ра..іма, рэ..ька, ..ядуля, ся..іць, ..якуй.

Правообладатель Народная асвета

1. Прачытайце.

Прыйшоў верасень. Дзеці спяшаюцца ў школу. Яны радуюцца пачатку навучальнага года. Вучні заходзяць у светлы клас. Як тут прыгожа і ўтульна! Парты блішчаць, як люстэрка. Звініць званок. У клас уваходзіць любімая настаўніца. Пачынаецца першы ўрок.

Вызначце асноўную думку тэксту. Прыдумайце загаловак. Запішыце тэкст.

2. Прачытайце. Прыдумайце загаловак. Запішыце сказы ў такім парадку, каб атрымалася апавяданне.

Лісце на дрэвах пажаўцела.
Не чуваць птушак.
Наступіла сумная восень.
Прайшло радаснае лета.
Яны паляцелі ў вырай.
Кветкі завялі.

3. Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы.

Нечакана сыпануў моцны дождж буйныя цёплыя кроплі гучна запляскалі па траве усе пачалі хавацца ад дажджу жучкі, матылькі, мухі пазалазілі хто куды.

Вызначце тэму тэксту. Прыдумайце загаловак. Запішыце правільна тэкст.

Правообладатель Народная асвета

4. Прачытайце. Вызначце тэму тэксту. Прыдумайце загаловак. Запішыце тэкст.

Увосень вавёркі кормяцца арэхамі і рыхтуюць сабе запасы на зіму. Арэхі і жалуды вавёрка хавае ў глыбокім дупле старога дрэва. Прынясе арэх ці жолуд і кіне ў дупло. Робіць яна кладоўкі і пад каранямі дрэў (*Віталь Вольскі*).

5. Прачытайце. Вызначце асноўную думку тэксту. Прыдумайце загаловак. Запішыце тэкст.

Усталявалася пагодная восень. Раніцы былі халодныя і бліскучыя ад дробнага інею, што ўсцілаў зямлю, стрэхі і платы. Але ён быў кволы і знікаў адразу з узыходам сонца.

Паляцелі ў вырай ластаўкі, буслы і шпакі. Сады і лясы атрасалі пажоўклае лісце (*паводле А. Чарнышэвіча*).

Што мы ведаем?

1. Колькі галосных гукаў у беларускай мове?
2. Колькі галосных літар?
3. Назавіце зычныя гукі.
4. Назавіце літары алфавіта па парадку.
5. Як праверыць напісанне парных звонкіх і глухіх зычных на канцы і ў сярэдзіне слова? Прывядзіце прыклады.
6. Якія галосныя пішуцца пасля цвёрдых зычных? А пасля мяккіх?

Правообладатель Народная асвета

7. Як пераносяцца словы з **ь** у сярэдзіне?

8. Якія галосныя пішуцца пасля зычных **ж, дж, р, ч, ш**?

9. Як пераносяцца словы з **дз, дж**?

10. Як пераносяцца словы з аднаго радка на другі?

11. Што такое сказ?

22

СЛОВА

Слова як адзінка мовы

1. Разгледзьце малюнкі. Падпішыце іх з улікам загалоўкаў і пытанняў.

Назвы прадметаў (хто? што?):

Назвы прымет (які? якая? якое? якія?):

Правообладатель Народная асвета

Назвы дзеянняў (што робіць?):

Выкарыстайце словы: *малюе, дрэва, чытае, заяц, пралеска, калючы, смачная, сіняе, кляновыя, сядзіць.*

2. Разгледзьце малюнкі.

Правообладатель Народная асвета

- Падпішыце іх.
- Да кожнай назвы прадмета падбярыце назву прыметы.
- Складзіце 2-3 сказы па малюнках і запішыце іх.

зімаро́дак **ча́пля** **каршу́н** **зубр** **лось**

3. Прачытайце і вызначце, у якім слупку напісаны словы, а ў якім сказы. Запішыце сказы.

Дзень, сонца. Пагодны, восеньскі, чырвоны. Стаяць, узыходзіць.	Стаялі пагодныя восеньскія дні. Узыходзіла чырвонае сонца.

На якія пытанні адказваюць словы левага слупка і што яны называюць?
З чаго складаюцца сказы?

Словы называюць разнастайныя прадметы, прыметы, дзеянні; са слоў складаюцца сказы.

4. Складзіце са слоў кожнага радка сказы і запішыце.

вёска, каля, наша, стаіць, **лесу**
дзецям, **звяроў**, **ляснік**, пра, расказвае, часта
дзеці, жыхароў, любяць, лясных

Растлумачце правапіс літар **е**, **ё**, **я** ў выдзеленых словах.

Назавіце словы, якія адказваюць на пытанне хто?

Правообладатель Народная асвета

5. Прачытайце словы і спішыце. Вусна да кожнага слова пастаўце пытанні. Што абазначаюць словы?

вялікія, метро, павялі, прыгожыя, прыехалі, разглядалі, тралейбусы, цырк, экскурсія

Лексічнае значэнне слова

23

1. Прачытайце смяшынку.

Слава і Віця хваляцца:

— А мой тата — адпускнік. Ён працуе на складзе, адпускае розныя тавары.

— А мой тата — грузавік. Ён на станцыі грузіць тавары ў вагоны.

Што выклікала ў вас усмешку?
Як называецца работнік склада?
Як называюць таго, хто працуе на пагрузцы і разгрузцы тавараў?
Якія словы пераблыталі хлопчыкі?

Словы называюць прадметы, прыметы, дзеянні. Тое, што абазначае слова, з'яўляецца яго лексічным значэннем. Напрыклад, слова *адпускнік* называе таго, хто знаходзіцца ў водпуску, у адпачынку. Такім чынам, лексічнае значэнне слова *адпускнік* — **той, хто знаходзіцца ў водпуску, у адпачынку**; лексічнае значэнне слова *грузавік* — **машына, якая перавозіць грузы.**

Правообладатель Народная асвета

2. Адгадайце словы па іх лексічным значэнні.

Невялікі жвавы звярок з доўгім пушыстым хвастом.

Прадмет для захоўвання пісьмовых прылад.

Чалавек, які вучыць школьнікаў.

Выкарыстайце словы: *настаўнік, пенал, вавёрка.*

Запішыце, падзяляючы словы для пераносу.

3. Прачытайце. У правым слупку знайдзіце словы, якія адпавядаюць прыведзеным значэнням.

1) Назва прадмета, адказвае на пытанне што?, абазначае нябеснае свяціла, якое ярка асвятляе і грэе нашу зямлю.

2) Назва дзеяння, адказвае на пытанне што рабіць?, мае значэнне **«рухацца, ступаючы нагамі».**

3) Назва прыметы, адказвае на пытанне які?, абазначае яркі колер, блізкі да пунсовага.

месяц

сонца

плыць

ісці

сонечны

чырвоны

Запішыце словы. Са словамі складзіце сказы і запішыце іх.

вéтразь **трывáлая** **пярсцёнак**

сурвэ́ткі **і́ней** **шэ́рань**

Правообладатель Народная асвета

4. Прачытайце. Устаўце патрэбныя літары. Запішыце. Напісанне праверце па арфаграфічным слоўніку.

ветра.ь, гр.мець, кв.тнець, разм.ркаваць, ураж.нне, ч.тыры

Падкрэсліце слова, якое мае наступнае лексічнае значэнне:

Умацаваны на мачце кавалак трывалай тканіны, якая надзімаецца ветрам і дапамагае судну плыць.

Лексічныя значэнні слоў раскрываюцца ў тлумачальным слоўніку.

Чытаем у слоўніку так: **шэрань**, -і, *творн.* -нню, *ж.* Іней на галінках дрэў, на правадах.

Растлумачце або прачытайце ў тлумачальным слоўніку лексічнае значэнне слоў з практыкавання **4**.

Правообладатель Народная асвета

5. З дапамогай тлумачальнага слоўніка раскрыйце значэнні слоў. Запішыце гэтыя значэнні.

абавязак, адвага, бутон, кветка

Што новае пра значэнні гэтых слоў вы даведаліся са слоўніка?

24

Прамое і пераноснае значэнне слова

1. Разгледзьце малюнкі.

Падпішыце малюнкі, ужываючы слова *залаты.*

Выкарыстайце словы: *пярсцёнак, восень, сэрца, рукі.*

У якім выпадку слова *залаты* мае прамое значэнне — **зроблены з золата**?

Якія яшчэ значэнні мае гэта слова?

Значэнне слова можа быць **прамым** і **пераносным.**

Правообладатель Народная асвета

Прамое значэнне — гэта асноўнае значэнне слова: *залаты пярсцёнак*.

Пераноснае значэнне — гэта такое лексічнае значэнне, якое ўзнікае пры пераносе ўласцівасцей аднаго прадмета на другі: *залатыя рукі*.

Увага!

У тлумачальным слоўніку пераноснае значэнне слова пазначаецца паметай *перан*. Напрыклад:

Закутак, -тка, *м*. **1.** Вугал у якім-небудзь памяшканні, на двары. *Усе закуткі на двары аблазіў*. **2.** *Перан*. Аддаленае, глухое месца. *У якіх закутках лесу я ні пабываў!*

2. Прачытайце. Параўнайце сказы правага і левага слупкоў і скажыце, у якіх з іх выдзеленыя словы маюць пераноснае значэнне.

1) Бялявыя **вусы** былі падкручаны.	1) А там ячмень з калючымі **вусамі**.
2) З крана **льецца** вада.	2) З гаю **льецца** салаўіны спеў.

Запішыце сказы са словамі ў пераносным значэнні.

3. Прачытайце. Утварыце словазлучэнні і запішыце.

Светлыя (*валасы, успаміны*).

Правообладатель Народная асвета

Высокі (*абавязак, гара*).
Гарачае (*сэрца, бульба*).
Лёгкі (*пух, машына*).

Словы з прамым значэннем падкрэсліце адной прамой лініяй, а з пераносным — дзвюма.

4. Прачытайце.

залаты пярсцёнак — **залаты** месяц, **гараць** дровы — **гараць** кветкі, **галоўка** дзіцяці — **галоўка** часнаку

У якіх прыкладах выдзеленыя словы маюць прамое лексічнае значэнне, а ў якіх — пераноснае?

Складзіце і запішыце сказы са словазлучэннямі, у якіх ёсць словы з пераносным значэннем.

5. Прачытайце.

Мыецца краска расой, уціраецца цёплага сонца святлом (*Я. Колас*). Ціха шэпча асака, між ракіт спіць рака (*А. Астрэйка*). Вяслуюць крыламі буслы, плывуць, плывуць над светам (*Р. Барадулін*). На сцяблінку сонца села, белы капялюш надзела (*В. Жуковіч*).

Запішыце. Падкрэсліце словы, ужытыя ў пераносным значэнні.

Правообладатель Народная асвета

Словы, блізкія па значэнні. Словы з супрацьлеглым значэннем

1. Прачытайце два наступныя тэксты. Спішыце тэкст, які вам больш спадабаўся.

I. Мама з татам ішлі па тратуары. За імі ішоў Алесь. Ён ішоў асцярожна, баючыся запэцкаць новыя чаравікі. За Алесем ішоў маленькі чорненькі сабачка.

II. Мама з татам ішлі па тратуары. За імі крочыў Алесь. Ён ступаў асцярожна, баючыся запэцкаць новыя чаравікі. За Алесем тупаў маленькі чорненькі сабачка.

? Чым адрозніваюцца гэтыя тэксты?
Ці змяніўся сэнс тэксту са зменай некаторых слоў у ім? Чаму?

Увага!
Аб адным і тым жа можна сказаць, выкарыстоўваючы розныя словы з блізкім значэннем: *ішоў, крочыў, тупаў*.

2. Прачытайце сказы. Знайдзіце словы з блізкім значэннем.

Каля шашы сям-там палаюць агеньчыкі макаў. Бальшак з векавымі бярозамі прывёў нас да будынка. За шляхам пачынаўся лес. Дарога ішла жытам. Удаль разаслаўся гасцінец.

Правообладатель Народная асвета

Растлумачце лексічнае значэнне слоў *бальшак, гасцінец, шаша* з дапамогай тлумачальнага слоўніка.

Выпішыце словы з блізкім значэннем. Прадоўжыце рад.

дзьмухаве́ц **сце́жка**

3. Прачытайце. Якія з наступных слоў «сябруюць»?

злаваць, зразумець, мыцца, гневацца, умывацца, пазнаць, купацца, абурацца, разабрацца, канчаць, заканчваць, завяршаць

Словы з блізкім значэннем запішыце групамі.

Узор: *падаць, ападаць, валіцца*.

4. Гульня. Настаўнік называе групы слоў з блізкім значэннем. Калі сярод іх будуць «лішнія» словы, вучні пляскаюць у далоні. Перамагае той, хто быў уважлівы.

5. Прачытайце рады слоў. У кожным радзе выключыце «лішняе» слова. Дакажыце.

загад, каманда, камандзір
загарэцца, закружыцца, успыхнуць
адуванчык, васілёк, дзьмухавец
ліпавы, ліпкі, клейкі

Запішыце групамі словы з блізкім значэннем.

Правообладатель Народная асвета

6. Прачытайце сказы. Знайдзіце словы з блізкім значэннем. Выпішыце іх групамі. Прадоўжыце рады.

Завіруха бушавала ўсю ноч і ўвесь дзень. Завея ўсхадзілася яшчэ зранку. На дварэ гуляла мяцеліца.

Напоўніць лес птушыны свіст, травою луг акрыецца. У першы раз пушча чула такія гукі. Ачнецца гай і з песнямі ў зялёны ліст адзенецца.

26

1. Разгледзьце малюнкі і скажыце, якія са слоў, што змешчаны ў цэнтры, характарызуюць дадзеныя прадметы.

салодкі

густы

высокі

кіслы

сумны

нізкі

вясёлы

рэдкі

Правообладатель Народная асвета

Запішыце парамі словы з процілеглым значэннем.

Узор: *нізкі — высокі.*

2. Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс. Спішыце. Назавіце і падкрэсліце словы з супрацьлеглым значэннем.

Ранняя птушка зерне клюе, а позняя вочкі трэ. Новых сяброў набывай, але і старых не забывай. Лепш горкая праўда, чым салодкая мана.

3. Прачытайце. Да слоў левага слупка падбярыце з правага слупка словы з супрацьлеглым значэннем.

доўгі	*кароткі, смачны*
кіслы	*гарачы, салодкі*
мір	*адвага, вайна*
закрыць	*адарваць, адкрыць*

- Запішыце словы парамі.
- Выпішыце словы, якія не маюць пары. Падбярыце да іх словы з супрацьлеглым значэннем.
- З любой парай слоў складзіце і запішыце сказы.

4. Прачытайце пары слоў. Па якіх прыметах можна супрацьпаставіць наступныя словы? Запішыце назвы гэтых прымет.

Вожык — слон, шакалад — рэдзька, зіма — лета, цукерка — лімон, дарога — сцежка.

Узор: *вожык малы — слон вялікі.*

Правообладатель Народная асвета

5. Прачытайце прыказкі, устаўляючы прапушчаныя словы з супрацьлеглым значэннем. Растлумачце сэнс прыказак.

Хто чужога не шануе, той ... не мае. Работы многа, а толку ... . Лёгка пасварыцца, ... памірыцца. Добрае чуваць далёка, а ... яшчэ далей. Свая хатка — родная матка, а ... — мачаха.

Выкарыстайце словы: *чужая, дрэннае, цяжка, мала, свайго.*

Запішыце прыказкі. Падкрэсліце словы з супрацьлеглым значэннем.

27

1. Прачытайце словы. Запішыце іх парамі.

Узор: *хадзіць — вандраваць.*

адважны, даўні, глядзець, смелы, **старажытны**, паглядаць

Растлумачце значэнне выдзеленых слоў.
Звярніцеся да тлумачальнага слоўніка.

2. Прачытайце словы. Знайдзіце ў кожным радку «лішняе» слова.

ззяць, свяціць, смяяцца
гарэць, цвісці, палыхаць

Запішыце блізкія па значэнні словы.
Вусна складзіце з імі сказы.

Правообладатель Народная асвета

3. Прачытайце. Растлумачце значэнне выдзеленых слоў. Падбярыце да іх словы з супрацьлеглым значэннем. Запішыце.

стары дом — ... **горкія** ягады — ...
свежы хлеб — ... **родная** зямля — ...

4. Прачытайце. Растлумачце лексічнае значэнне слоў, што у дужках.

Над вадою (*калыша, трасе*) траву вецярок. Восеньская імгла пачынала пераходзіць у (*дробны, малы*) дождж. Над хатай (*шумеў, гудзеў*) векавы дуб.

Запішыце сказы, выбіраючы патрэбныя словы.

5. Прачытайце. Замяніце словы, што ў дужках, на супрацьлеглыя па значэнні. Запішыце сказы.

Усё лета стаяла (*дажджлівае*) надвор'е.
Па правілах гульні трэба было (*кідаць*) мяч.
Мама купіла вельмі (*чэрствыя*) булачкі.
Восенню сяляне пачалі (*саджаць*) ураджай бульбы.

Выкарыстайце словы: *сухое, лавіць, свежыя, збіраць*.

Што мы ведаем?

1. Што называюць словы?
2. Што з'яўляецца лексічным значэннем слова?

Правообладатель Народная асвета

3. Для чаго служыць тлумачальны слоўнік?

4. Знайдзіце ў тлумачальным слоўніку лексічнае значэнне слоў *руплівы, майстэрня.*

5. У якіх прыкладах выдзеленыя словы маюць прамое лексічнае значэнне, а ў якіх — пераноснае: *снег* ***ідзе*** *— хлопчык* ***ідзе;*** ***свішча*** *вецер —* ***свішча*** *салавей?*

6. Прывядзіце прыклады слоў з блізкім значэннем.

7. Прывядзіце прыклады слоў з супрацьлеглым значэннем.

28

Састаў слова. Канчатак слова

1. Прачытайце. У канцы сказаў паніжайце голас і рабіце паўзу. У выдзеленых словах назавіце частку, якая змяняецца.

Яблыня

Ля дарогі расце **яблыня.** Гэтую **яблыню** пасадзіў мой брат. Вясной на **яблыні** цвітуць ружовыя кветкі. Тады над яблыняй ад ранку да вечара гудуць пчолкі. А восенню з яблыні мы здымаем багаты ўраджай.

Спішыце, зменную частку выдзеленых слоў заключыце ў рамку.

Правообладатель Народная асвета

Зменная частка слова называецца **канчаткам.** З дапамогай канчаткаў утвараюцца розныя формы слова: *яблын**я**, яблын**і**, над яблын**яй***.

Увага!

Каб знайсці канчатак, напрыклад, у слове *снегам,* неабходна змяняць гэтае слова: *снег, снегу, снегам* і г.д. Зменная частка слова называецца канчаткам. Знаходзім тую частку слова, якая змяняецца. У слове *снегам* канчатак **-ам**. Выдзяляем яго знакам ☐.

Большасць канчаткаў можна пачуць і ўбачыць: *снег**у**, снег**ам**, вяз**у**, вяз**еш***. Але ёсць нячутныя і нябачныя канчаткі: *снег, вёз.*

Такія канчаткі называюцца **нулявымі.**

2. Прачытайце сказы. Дапішыце канчаткі ў слове *паляна* ў адпаведнасці з пытаннямі. Запішыце.

У глухім зялёным гушчары ёсць (што?) палян. . Назбіраўшы поўныя кошыкі грыбоў, мы прыходзім (куды?) на палян. і адпачываем. А (на чым?) на палян. шмат суніц. Стракатыя матылькі лётаюць (над чым?) над палян.. .

Абазначце рамачкай канчатак у розных формах слова *паляна.*

Пагутарым. Што вам падабаецца больш: збіраць суніцы ці грыбы?

Правообладатель Народная асвета

3. Прачытайце, змяняючы слова *вавёрка* так, як патрабуе сэнс сказаў.

Раман і Петрык убачылі на дрэве (*вавёрка*). (*Вавёрка*) скакала з галінкі на галінку. За (*вавёрка*) сачыла ліса. Але раптам (*вавёрка*) не стала. Яна схавалася ў дупло.

Спішыце. Абазначце рамачкай канчатак у розных формах слова *вавёрка*.

4. Прачытайце.

трава — трав..
пчала — пчал..
кветка — кветк..
мёд — мёд..
дуб — дуб..
вуліца — вуліц..

● Запішыце словы па ўзоры. Абазначце канчаткі.

Узор: *трав*а — *трав*ой.

● Выпішыце словы з нулявым канчаткам. Прадоўжыце рад.

● Далучыце да частак слоў патрэбныя канчаткі. Запішыце словы. Абазначце канчаткі.

святл., сонц., сін., пол., разумн., зямл., светл.

а е і ы о я у

5. Прачытайце. Змяніце слова *кот* па сэнсе. Запішыце. Абазначце канчаткі.

У нас ёсць кот. У (*кот*) прыгожы пушысты хвост. Раней у нас такога (*кот*) не было. Тата

Правообладатель Народная асвета

часта ловіць (*кот*) рыбу. Я вельмі люблю гуляць з (*кот*).

Пагутарым. Раскажыце пра свайго *ката* (*сабаку*).

29

1. Прачытайце словы левага і правага слупкоў. Паспрабуйце скласці з гэтых слоў сказы.

спяваць, машына, чорны, сонца	сад, звінець, птушыны, голас.

Ці спалучаюцца словы левага слупка адно з другім па сэнсе? Ці можна з іх скласці сказ? Ці спалучаюцца словы правага слупка па сэнсе? Ці можна сказаць, што гэта сказ?

Паспрабуйце змяніць некаторыя словы правага слупка так, каб атрымаўся сказ.
Запішыце сказ і падкрэсліце тую частку, якая змянілася ў словах пры пабудове сказа.

Канчатак служыць для сувязі слоў у сказе: *Птушын**ымі** галас**амі** звін**яць** сад**ы**.*

2. Прачытайце прыказкі. Як вы іх разумееце? Словы ў дужках змяніце, як патрабуе сэнс.

Чалавек без (***Радзіма***), *як салавей без* (***песня***). *Той герой, хто за* (***Радзіма***) *гарой. Чалавек без* (***песня***), *як птушка без* (***крылы***).

Запішыце прыказкі. Абазначце канчаткі.

Правообладатель Народная асвета

3. Прачытайце. Што абазначаюць словы кожнага радка — прадмет, дзеянне, прымету?

парта, парту, партай, парты
пішу, пішаш, пішам, пішуць
сіні, сіняга, сіняму, сінім, сіняе

Спішыце. Абазначце канчаткі.

4. Прачытайце. Слова *чалавек* змяніце так, каб яно правільна «звязалася» са словам *прыгожы*. Запішыце гэтыя словы і абазначце канчаткі.

прыгожы (*чалавек*), прыгожага (*чалавек*), прыгожаму (*чалавек*), з прыгожым (*чалавек*)

Пагутарым. Якога чалавека можна лічыць прыгожым?

5. Прачытайце скорагаворку спачатку павольна, а потым хутка. Спішыце. У выдзеленых словах абазначце канчаткі.

Шылам **мушка** шыла **вушка.**

6. Прачытайце. Змяніце словы ў дужках, як патрабуе сэнс. Запішыце. Абазначце канчаткі.

Пасябраваць (з кім?) з (*дзяўчынка*), чытаць (што?) (*казка*), быў (дзе?) у (*тэатр*), шанаваць (што?) (*кніга*), падзякаваць (каму?) (*сябар*), адпачывалі (дзе?) пад (*дуб*).

Правообладатель Народная асвета

тэ́атр **уну́кі** **усе́дскі** **страха́**

1. Прачытайце. Назавіце канчаткі ў словах.

цікавая гульня, новы стол, дзіцячы куток, шырокая дарога, высокі дуб, **касмічнае падарожжа**, адважны ўчынак

Складзіце сказы з выдзеленымі словазлучэннямі. Запішыце.

2. Прачытайце. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Запішыце.

Белы бусел лічыцца сімвалам дабра і (чаго?) ... . Гняздо бусел звычайна размяшчае на (чым?) ... ці на страсе. Паміж (кім?) ... і (кім?) ... існуе (якая?) ... дружба.

Выкарыстайце словы: *шчасце, дрэва, бусел, чалавек, трывалая.*

Знайдзіце ў тлумачальным слоўніку лексічнае значэнне слова *страха.*

3. Са слоў кожнага радка складзіце сказы.

Дзеду, семдзесят дзевяць, **Апанас**, гадоў.
Ён, сядзець, на, любіць, **вуліца**.
Унукі, дзеці, і, расказваюць, **казка**, суседскія, яму.

Правообладатель Народная асвета

Дзед, вельмі, гісторый, многа, ведае, цікавых.

Змяніце канчаткі ў выдзеленых словах, як патрабуе сэнс. Запішыце сказы.

Пагутарым. Раскажыце сябрам пра свайго дзядулю (*бабулю*).

4. Прачытайце. Назавіце канчаткі ў словах.

новая кніга, залатая восень, дбайны гаспадар, бліскучы снег, **цяжкае пытанне, добрасумленны вучань**

- Спішыце. Абазначце ў словах канчаткі.
- Растлумачце сэнс выдзеленых словазлучэнняў. Складзіце з імі сказы і запішыце.
- Знайдзіце словазлучэнні з пераносным значэннем. Падбярыце да іх словазлучэнні з прамым значэннем. Запішыце.

5. Прачытайце. Спішыце. Абазначце канчаткі.

Узор: *поле* — *у полі*.

вясна — за вясной	неба — у небе
лета — за летам	сонца — на сонцы
мора — на моры	зорка — зорку
вада — вады	зара — зары
рака — ракой	святло — у святле

Правообладатель Народная асвета

Аснова слова

1. Прачытайце. Змяніце словы *восень, неба* па ўзоры.

Узор: (што?) *вёска*, (чаго?) *вёскі*, (чым?) *вёскай*.

Запішыце словы і абазначце канчаткі. Частку слоў без канчатка падкрэсліце знакам ____. Ці змяніўся сэнс гэтых слоў са зменай канчаткаў?

Частка слова без канчатка называецца **асновай**: *жураўл**і***, *жураўлін**ая***, *звін**яць***, *крык*___. Аснова слова ўказвае на яго сэнс.

2. Прачытайце казку. Выпішыце выдзеленыя словы і падкрэсліце ў іх аснову.

Як каты варылі юшку

Сабраліся аднойчы **каты** і пайшлі на **раку рыбу** лавіць. Налавілі яны рыбы, і **кот** Мітрафан запытаўся:

— Смажыць будзем ці **юшку зварым**?

— Юшку! — закрычалі каты.— Юшку!

Кот Мітрафан апусціў у кацёл печкуроў, кінуў туды рознай **прыправы** і сказаў:

— Няхай варыцца. А я прайдуся, адпачну трошкі (*Я. Пархута*).

Правообладатель Народная асвета

Растлумачце сэнс слова *юшка*. Звярніцеся да тлумачальнага слоўніка.

Пагутарым. Даведайцеся ў дарослых, як гатуецца юшка.

Раскажыце свайму сябру, як трэба гатаваць юшку.

3. Прачытайце словы. Спішыце. Вызначце аснову.

падушка, соня, пальчаткі

Растлумачце, чаму так названы прадметы.

Раскажыце пра адно з гэтых слоў па пытаннях.

Чаму гэты прадмет так называецца?

Якая частка дапамагае растлумачыць назву прадмета?

Які абавязак выконвае аснова слова?

4. Прачытайце часткі слоў у слупках. Якая гэта частка? Якую частку трэба далучыць, каб атрымалася слова? Спішыце словы. Абазначце аснову і канчатак.

паветр.	халодн.	(я) ляч.
сонц.	позн.	крыч.
хмар.	хмурн.	плыв.
павуцін.	птушын.	адлята.

5. Прачытайце скорагаворку. Спішыце. Абазначце аснову ў выдзеленых словах.

Мама **шапку** шыла Сашу.
Шапку **Сашу** шыла мама.

Правообладатель Народная асвета

6. Прачытайце прымаўкі. Растлумачце іх сэнс. Спішыце. У выдзеленых словах абазначце аснову і канчатак.

Якая Агатка, такая і ***хатка.***
Добрая *каша, ды* ***малая*** *чаша.*
Бывала, што й ***варона*** *кукавала.*
Хоць рыкае, але ***прывыкае.***

32

1. Прачытайце верш.

Калі ласка, дзякуй, **добры** дзень —
ветлівыя **словы** чую ад людзей.
Я таксама **буду** імі даражыць:
з ветлівымі словамі лёгка жыць.

Т. Кляшторная.

● Спішыце. Абазначце ў выдзеленых словах аснову і канчатак.
● Складзіце са словамі ветлівасці некалькі сказаў. Запішыце. У словах, што называюць прыметы, абазначце аснову і канчатак.
● Прадоўжыце рад ветлівых слоў (*пісьмова*).

2. Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Як ты да людзей, так і ***людз.*** *да цябе.*
Ласкавае ***слов.,*** *што* ***веснав.*** *дзень.*
Сам сябе не хвалі, няхай ***людз.*** *пахваляць.*

Спішыце, дапісваючы канчаткі. У выдзеленых словах абазначце аснову і канчатак.

Правообладатель Народная асвета

калі ла́ска зрабі́це ла́ску бу́дзьце ласка́вы

3. Уявіце сабе, што вас мама паслала да суседзяў пазычыць солі. Як вы будзеце прасіць? Вусна ў парах выкажыце просьбу. Запішыце просьбу.

Выкарыстайце звароты ветлівасці: *добры дзень, будзьце ласкавы, дзякуй Вам*.

У словах, што называюць прадмет, абазначце аснову і канчатак.

4. Прачытайце.

чытаю кніг□, спяваю песн□, збіраем грыб□, дапамагаю бабул□, сасновы лес□, ветлівы хлопчык□, працавіт□ дзяўчынка, чул□ чалавек, цікавы фільм□

- Запішыце, устаўляючы, дзе трэба, канчаткі.
- Складзіце і запішыце сказ са словазлучэннем *ветлівы хлопчык*.

Колькі літар і колькі гукаў у слове *фільм*?

- Складзіце некалькі сказаў на тэму «**Ветлівасць**». Запішыце іх.

Выкарыстайце словазлучэнні: *ветлівы чалавек, працавітая дзяўчынка, дапамагаю бабулі, чулы чалавек*.

Правообладатель Народная асвета

5. Прачытайце аднакаранёвыя словы.

1) Зіма, зімачка, зазімак.

2) Яблык, яблычак, яблычны, яблыня, яблынька.

3) Дабро, дабрыня, добры.

4) Зямля, падземны, зямлісты, прыземісты.

5) Зубр, зубрыны, зубраня, зуброўка.

Спішыце. Абазначце ў словах асновы.

33

1. Разгледзьце малюнак.

Правообладатель Народная асвета

Прачытайце сказы. Ці адпавядаюць яны малюнку? Размясціце сказы так, каб атрымаўся звязны тэкст. Прыдумайце загаловак. Запішыце.

Да хлопчыка прыйшлі Юрась і Аленка. Ён даўно ўжо не ходзіць у школу. Яны паведамілі свайму сябру пра школьныя справы. Дзяніс захварэў. Вось якія добрыя сябры ў Дзяніса. Дзяніска быў вельмі рады прыходу дзяцей.

Што здарылася з Дзянісам?
Хто прыйшоў яго праведаць?
Што зрабілі дзеці?
Якія пачуцці выклікаў у Дзяніса прыход дзяцей?

Вусна перакажыце тэкст. Выкарыстайце малюнак.

34

Корань слова

1. Прачытайце. Растлумачце значэнне выдзеленых слоў.

Каля нашай школы вучні **пасадзілі сад**. Яны вырошчваюць **садовыя** дрэўцы.

Выпішыце выдзеленыя словы ў слупок. Абазначце дужкай ⌒ агульную частку іх асноў.

Ці звязаны гэтыя словы паміж сабой па сэнсе?

2. Прачытайце словы кожнага слупка. Параўнайце іх паміж сабой. Якія са слоў маюць агуль-

Правообладатель Народная асвета

ны сэнс і агульную частку, а якія толькі агульны сэнс? У якім слупку запісаны аднакаранёвыя словы?

гаворка	гутарка
гутарка	гутарыць
размова	гутарлівы

Запішыце аднакаранёвыя словы і абазначце корань.

Увага! Як знайсці корань у слове?

Каб знайсці корань у слове *пасадка*, трэба разважаць так. Падбіраю да гэтага слова аднакаранёвыя словы: *сад, садок, садзіць, пасадзіць, перасадзіць, садоўнік*. Выдзяляю агульную частку *сад-*(*садз-*). Гэта і ёсць корань слова *пасадка*. Абазначаю яго значком ⌒: *пасадка*.

3. Прачытайце і скажыце, у якім слупку змешчаны аднакаранёвыя словы, а ў якім — розныя формы аднаго і таго слова. Скажыце, як вы гэта вызначылі.

вучань	вучаніца
вучоба	вучаніцы
вывучыць	вучаніцу
вучоны	вучаніцай

Спішыце аднакаранёвыя словы і абазначце корань.

Колькі гукаў і колькі літар у слове *вывучыць*?

Правообладатель Народная асвета

4. Прачытайце і скажыце, якія рады слоў з'яўляюцца аднакаранёвымі, а якія — блізкімі па значэнні? Дакажыце.

1) Смелы, смеласць, асмеліцца.
2) Смелы, адважны, храбры.
3) Дарога, бальшак, гасцінец.
4) Пераезд, паездка, раз'езд.

Спішыце аднакаранёвыя словы і абазначце корань. Колькі літар і колькі гукаў у слове *бальшак*?

5. Утварыце аднакаранёвыя словы. Запішыце. Абазначце корань.

што?	што рабіць?	які?
рыба	...	...
святло	...	...
мароз	...	...

35

1. Прачытайце. Знайдзіце аднакаранёвыя словы. Выпішыце іх. Абазначце корань.

Ноччу прайшоў цёплы дожджык-грыбасей. Яська ўзяў кошык і накіраваўся ў лес. Знайшоў адзін грыб і радуецца: «Вось і будзе грыбная поліўка!..» (*П. Паўлаў*).

Вусна прадоўжыце апавяданне. Прыдумайце загаловак.

Знайдзіце ў тлумачальным слоўніку лексічнае значэнне слова *поліўка*.

Правообладатель Народная асвета

2. Прачытайце. Скажыце, ці ўсе словы ў кожным радку з'яўляюцца аднакаранёвымі. Якое слова «лішняе» і як вы гэта вызначылі?

вадзіць, вадзяны, вадзяністы, вадзянік
каса, касавіца, касіць, касога
зранку, паранены, ранак, ранішні
каза, казачнік, казаць, пераказ

З кожнага радка выпішыце аднакаранёвыя словы.

У адным слове (*на выбар*) абазначце канчатак, аснову і корань.

3. Прачытайце.

Восеньскі дзень,
нібы весні,
сонца з блакіту
глядзіць.

Саджанцы дзеці
прынеслі
сад свой
ля рэчкі садзіць.

А. Дзеружынскі.

Спішыце. Знайдзіце аднакаранёвыя словы і абазначце корань.

4. Прачытайце.

І гэты край, дзе нарадзіўся, **рос**,
дзе днее, вечарэе і світае,
усё — ад зор далёкіх і да **рос** —
твая Радзіма, родная, святая.

Р. Барадулін.

Правообладатель Народная асвета

Скажыце, чаму выдзеленыя словы не з'яўляюцца аднакаранёвымі.

Ці заўсёды словы, у якіх карані супадаюць, з'яўляюцца аднакаранёвымі?

Спішыце верш. У словах *родная, светлая* абазначце канчатак, аснову, корань.

5. Прачытайце скорагаворку спачатку павольна, а потым хутка.

У двары **горка**, пад **гарой** норка.

Спішыце. У выдзеленых словах абазначце канчатак, аснову, корань.

6. Прачытайце словы. Запішыце радамі аднакаранёвыя словы. Абазначце корань.

школа, дружба, школьны, па́ра, працоўны, школьнік, парні́к, дружыць, мора, парыць, праца, прыморскі, працаваць, марак

36

1. Утварыце аднакаранёвыя словы.

што?	што рабіць?	які?
зіма	...	...
...	карміць	...
...	...	вясёлы
...	...	халодны

Запішыце. Абазначце корань.

Правообладатель Народная асвета

лі́пень **жні́вень** **вясёлка** **вясе́лле**

2. Прачытайце.

ліпень, жнівень, верасень, лістапад, снежань, сакавік, красавік

Адкажыце, чаму так названы месяцы. Запішыце аднакаранёвыя словы і абазначце корань.

Узор: *ліпень — ліпа, ...*

Якая частка слова дапамагае высветліць сэнс назвы?

3. Прачытайце.

пяць, рачны, казка, зіма, пяцярня, расказваць, перадзім'е, пяцёрка, пераказ, зазімак, упяцярых, зімовы, рака, зімаваць, прырэчны, казаць, дрэва, зарэчны, драўляны

Спішыце. Абазначце ў словах корань.

Узор: *пяць, пяцярня, пяцёрка, упяцярых.*

4. Прачытайце. Складзіце сказы. Пры неабходнасці змяняйце канчаткі слоў. Запішыце тэкст.

Восень

Добры, і, агародніна, вырасцілі, сяляне, ураджай, садавіна.

Стаяць, дні, пагодныя.

Усё, у, прывесці, трэба, парадак.

Правообладатель Народная асвета

Яблыкі, зняць, **грушы**, слівы.
Буракі, і, выкапаць, морква, бульба.
Школьнікі, у, і, на, старанна, агарод, працуюць, сад.

У выдзеленых словах абазначце канчатак, корань.

Пагутарым. Раскажыце, як вы дапамагалі бацькам.

5. Прачытайце прыказкі і прымаўкі. Растлумачце іх сэнс.

*І баран бы **касіў**, каб хто **касу** насіў.*
Дрэмлючы, нічога не выдрамлеш.

Спішыце. У выдзеленых словах абазначце корань.

Прыстаўка

37

1. Разгледзьце малюнкі і скажыце, чым яны адрозніваюцца. Якому малюнку які сказ адпавядае?

Правообладатель Народная асвета

Восенню жураўлі адлятаюць у вырай. А вясною яны зноў да нас прылятаюць.

Якое значэнне маюць аднакаранёвыя словы *адлятаюць* і *прылятаюць*?

ад
лятаюць
пры

Якая частка аднакаранёвых слоў *адлятаюць* і *прылятаюць* надае ім рознае значэнне?

Дзе ў словах стаіць гэтая частка?

Частка слова, якая стаіць перад коранем, называецца **прыстаўкай**. Прыстаўкі служаць для ўтварэння слоў: *ехаць* → ***вы***-*ехаць*; *пісаць* → → ***на***-*пісаць*.

2. Дадайце да слоў, што ў цэнтры малюнка, прыстаўкі і ўтварыце аднакаранёвыя словы.

Запішыце словы слупкамі. Абазначце прыстаўкі значком ⌐. Які асноўны абавязак прыстаўкі ў мове?

Правообладатель Народная асвета

3. Гульня. Хто хутчэй прыдумае і запіша як мага больш слоў, утвораных пры дапамозе розных прыставак ад слоў *пісаць*, *гарэць*.

4. Прачытайце. Выпішыце словы з прыстаўкамі, абазначце іх.

Заціхаюць гоні і даліны,
павучкі наткалі павуціны.
Ды развесілі на сонцы
свае белыя красёнцы. *Якуб Колас.*

Увага! Як знайсці ў слове прыстаўку?

Каб знайсці ў слове прыстаўку, трэба разважаць так. Падбіраю да гэтага слова аднакаранёвыя словы з іншымі прыстаўкамі або без прыставак: *пасадзіць, перасадзіць, пасадка, садок*. Параўноўваю гэтыя словы і выдзяляю корань *сад-*(*садз-*). Прыстаўка стаіць перад коранем. Значыць, у слове *пасадка* прыстаўка **па-**. Абазначаю прыстаўку знакам ⌐.

5. Прачытайце верш *С. Грахоўскага*.

Адшумела лета
роснымі лугамі.
Апусцела поле,
нівы адцвілі.

- Спішыце. Абазначце прыстаўкі.
- Утварыце словы з дапамогай прыставак **за-, пера-, вы-** ад слова *цвісці*.
- Складзіце сказы са словамі, утворанымі з дапамогай прыставак **за-, пера-, вы-** ад слова *цвісці*.

Правообладатель Народная асвета

1. Прачытайце верш **«Адлёт жураўлёў»**.

Адлятаюць бяспечнай дарогай,
крыл тугіх не даносіцца шум...
А ў іх крыках — спалох і трывога,
невыказная крыўда і сум.

Не сумуйце па родных балотах,
прылятайце з далёкіх краін,
на лугах заліўных між чароту
многа знойдзеце ўтульных мясцін.

М. Аўрамчык.

Выпішыце аднакаранёвыя словы. Абазначце ў іх корань і прыстаўку.

Колькі літар і колькі гукаў у слове *ўтульных*? Якія пачуцці выклікаў у вас гэты верш?

Пагутарым. Ці бачылі вы адлёт жураўлёў? Раскажыце.

Знайдзіце ў тлумачальным слоўніку лексічнае значэнне слоў *караван, чарот.*

2. Прачытайце словазлучэнні. Растлумачце іх сэнс.

падкрэсліць слова, падкласці камень, падрыць карэнне, падмыць бераг, падсыпаць бульбу, падпілаваць дрэва, падкараціць паліто

Спішыце. Абазначце прыстаўкі ў словах. Якое значэнне надае прыстаўка **пад-** гэтым словам?

Правообладатель Народная асвета

3. Прачытайце. Да выдзеленых слоў падбярыце словы з супрацьлеглым значэннем.

надводны карабель — **...** карабель
увайшоў у клас — **...** з класа
адлёт птушак — **...** птушак
прычаліў катар — **...** катар

Запішыце словазлучэнні і абазначце прыстаўкі.

4. Разгадайце рэбус.

Запішыце слова. Абазначце прыстаўку. Складзіце з атрыманым словам сказ.

5. Прачытайце загадкі. Адгадайце іх.

1) Вечарам прыляціць, усю ноч на зямлі праляжыць, а раніцай на неба паляціць.

2) Не агонь, а не схопіш — абпалішся.

3) Не згубіла, а ўсё шукае, не хворая, а ўсё крэкча.

Спішыце. Абазначце прыстаўкі.

39

1. Прачытайце. Адкажыце на пытанне тэксту.

Дзеці вельмі любяць мяне. Я ім расказваю пра нашу Бацькаўшчыну. Я іх знаёмлю з мінулым і сучасным Айчыны.

Лесарубы нарыхтавалі лесу. З яго зрабілі для мяне паперу. Пісьменнікі напісалі апавяданні і

Правообладатель Народная асвета

вершы. Мастакі намалявалі малюнкі. У друкарні надрукавалі і сшылі. Як мяне завуць?

А. Клышка.

Выпішыце словы з аднолькавай прыстаўкай. Абазначце ў іх канчатак, аснову, корань, прыстаўку.

2. Прачытайце выразна верш. Выпішыце словы з прыстаўкамі. Абазначце прыстаўкі.

Беражыце сшыткі, кніжкі!

Каб на кнігі мець паперу,
лесу шмат ідзе без меры.
— А ці вам, сябры, вядома,
як мы лес ратуем дома?

Непатрэбныя паперы
не выкідваем за дзверы
і блакнот абы-які
не парвём мы на шматкі.

Бо на фабрыцы ў машыну
ідуць яны замест драўніны.
Сшытак спісаны, шпалеры —
будзе новая папера.

Кніга... Там яшчэ адна —
і не зрэзана сасна.
Са старых газет рулон —
уцалеў ад згубы клён.

Правообладатель Народная асвета

Мы — прыроды вартавыя,
нам заўжды дапамагай —
кніжкі ўсе свае старыя
не выкідвай, а збірай.

Лесу шмат, а ўсё ж — не лішкі...
Беражыце сшыткі, кніжкі.

Л. Дайнека.

Пагутарым. Як вы адносіцеся да кніжак? Якую кніжку вы цяпер чытаеце? Раскажыце.

3. Прачытайце загадкі. Адгадайце іх.

1) У двары — вялікі дом,
нібы вулей, гулкі днём,
гул той вечарам змаўкае,
раніцою ажывае.
Хто наведае той дом,
набывае веды ён. *Н. Парукаў.*

2) Хто са мною пасябруе, той ужо не засумуе.

3) Языка хоць і не маю, а пра ўсё апавядаю.

Спішыце загадкі. Абазначце прыстаўкі.

4. Разгадайце рэбус. Запішыце слова. Абазначце прыстаўку. Складзіце і запішыце з атрыманым словам сказ.

Правообладатель Народная асвета

5. Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс. Спішыце прыказкі. Абазначце прыстаўкі.

Перш чым зайсці, падумай, як выйсці.
Колькі зробіш, столькі і заробіш.
Вучэнне — свет, а невучэнне — цемра.

Суфікс

40

1. Разгледзьце малюнкі. Як называюцца на малюнках машына і чалавек, які працуе на ёй?

Запішыце аднакаранёвыя словы, абазначце ў іх корань і канчатак.

Назавіце частку, якой адрозніваюцца паміж сабой гэтыя словы, і абазначце яе значком ⌒.

Скажыце, пасля якой часткі слова яна стаіць і для чаго служыць у мове.

Частка слова, якая стаіць пасля кораня, называецца **суфіксам.**

Суфіксы служаць для ўтварэння слоў з новым значэннем: *лес, лясны, лясні́к, лесавы.*

Правообладатель Народная асвета

2. Разгледзьце малюнкі. Назавіце намаляваныя прадметы і істоты. Якім словам названы большы прадмет, якім — меншы? Якое новае значэнне надаюць слову суфіксы?

стол	ліпа	нож	кот
столік	ліпка	ножык	каток

Складзіце вусна сказы са словамі.

3. Прачытайце словы. Спішыце па ўзоры.

сад — садок; лоб — лабок, куст — кусцік, дождж — дожджык, мост — мосцік, луг — лужок, грыб — грыбок, дзед — дзядок

Абазначце ў словах суфікс.

4. Пры дапамозе суфіксаў утварыце ад наступных слоў іншыя словы. Запішыце па ўзоры.

звон — званок	*нага — ножка*
кот —	рука —
нож — ножык	*ліст — лісток*
кош —	мост —

Правообладатель Народная асвета

● Складзіце 2 словазлучэнні з утворанымі словамі (*на выбар*).

● Абазначце ў словах корань і суфікс. Якое значэнне надаюць словам суфіксы **-ок, -к-, -ык, -ік**?

● З адным словам кожнага слупка (*на выбар*) складзіце і запішыце сказы.

Увага! Як знайсці суфікс у слове?

Каб знайсці суфікс у слове *лясны*, трэба разважаць так. Змяняю слова: *лясны, лясная, лясное, лясныя*. Выдзяляю ў слове *лясны* канчатак **-ы**. Падбіраю аднакаранёвыя словы *лясны, лес, ляснік, лесавы*. Выдзяляю агульную частку — корань *лес*-(*ляс*-). **Суфікс** — гэта частка слова, якая стаіць пасля кораня. Значыць, у слове *лясны* суфікс **-н-**. Абазначаю яго знакам ^ : *ляс^ны*.

5. Прачытайце скорагаворку спачатку павольна, а потым хутка.

Жук пытаецца ў жука:
— Ты чаму без **пінжака**?
— Я памыў свой **пінжачок**
І павесіў на **сучок**.

Спішыце. Абазначце суфікс у выдзеленых словах.

6. Прачытайце словы. Спішыце. Абазначце корань і суфікс.

мядовы, сасновы, лясны, садовы, бярозавы, мірны, зімовы, школьны, начны

Правообладатель Народная асвета

1. Прачытайце сказы. Спішыце.

Бяжыць палявая **дарожка** з пагорачка ў **лужок.** Здаецца, кінуў нехта **паясок** сярод палёў. Пасля **дожджыку** захаваліся на дарозе лужынкі. У вадзе плавала некалькі **лісцікаў** з **бярозкі.**

У выдзеленых словах абазначце канчатак, аснову, корань, прыстаўку, суфікс.

калекты́ў **пінжа́к** **падле́сак** **чарапа́ха**

2. Прачытайце. Спішыце, падбіраючы з дужак патрэбныя словы. Абазначце прыстаўкі. У выдзеленых словах абазначце суфіксы.

Калектыў

Скончыліся заняткі. Вучні разам з настаўнікам (*выйшлі, пайшлі*) на вуліцу. **Сцежкі** (*засыпала, перасыпала*) залатым лісцем. Усе дружна пачалі працаваць. Адны (*намяталі, падмяталі*) **дарожкі.** Другія (*адносілі, прыносілі*) лісце. Работа кіпела. Аднаму чалавеку цяжка было б (*зрабіць, перарабіць*) столькі. Вось што такое калектыў!

Пагутарым. Як вы разумееце словазлучэнне *залатое лісце?*

А вы працавалі на ўборцы лісця? Раскажыце.

3. Прачытайце. Запішыце словы без суфіксаў.

Узор: *лясок — лес.*

Правообладатель Народная асвета

сэрцайка, хатка, дожджык, дзіцятка, маленькі

4. Прачытайце словы. Спішыце. Абазначце суфіксы.

даярка, пекар, аптэкар, настаўнік, перакладчык, лётчык, наладчык

Знайдзіце ў тлумачальным слоўніку лексічнае значэнне незразумелых вам слоў.

5. Прачытайце верш. Спішыце. У выдзеленых словах абазначце канчатак, аснову, корань, прыстаўку, суфікс.

Займае ўвесь **узлесак**
зялёненькі **падлесак.**
Направа і налева
растуць **кусты** і дрэвы.
І **лозкі,** і бярозкі
сябруюць тут па-свойску.

М. Дукса.

42

1. Прачытайце тэкст.

Стаіць цудоўная пагодка. З раніцы бываюць **лёгкія замаразкі.** Удзень над апусцелымі палеткамі нізка плыве павуцінне. У небе **ланцужком** ляцяць журавы. Адзінокія **бярозкі** жаўцеюць між сосен і ялін.

Спішыце. У выдзеленых словах абазначце канчатак, корань, прыстаўку, суфікс.

Правообладатель Народная асвета

2. Ад слоў *рыба, зямля, мора* пры дапамозе суфіксаў **-ак-, -як-** утварыце новыя словы. Запішыце іх парамі. Складзіце з любой парай слоў сказы і запішыце.

3. Выпішыце са слоўніка па два словы, якія складаюцца: з кораня і канчатка; з прыстаўкі, кораня і канчатка; з прыстаўкі, кораня, суфікса і канчатка.

4. Прачытайце скорагаворкі спачатку павольна, потым хутка.

Гаварыў, гаварыў, недагаварыў, дагаворваў, дагаворваў ды загаварыўся.

Піліп да ліпы прыліп, да ліпы прыліп Піліп.

Стругаў, стругаў, недаструга ў, стаў дастругваць — пераструга ў.

Спішыце. Абазначце прыстаўкі. Вывучыце адну скорагаворку на памяць.

5. Утварыце імёны па бацьку з дапамогай суфіксаў **-авіч (-овіч)** і **-аўн- (-оўн-)** ад наступных уласных імён.

Узор: *Іван — Іванавіч, Іванаўна.*

Сямён, Ігнат, Пётр, Піліп.

Запішыце. Абазначце суфікс.

Назавіце сваё імя і імя па бацьку.

Правообладатель Народная асвета

1. Прачытайце тэкст.

Жаўтушка

У жывым кутку вучні пасялілі чарапаху. Яна была жоўтага колеру. Дзеці назвалі яе Жаўтушкай. Жаўтушка вялікая і рахманая. Любіць яна цёплыя дні. Падзьме халодны вецер — разграбе Жаўтушка пясок і схаваецца ў ямку.

Адкажыце на пытанні, выкарыстоўваючы тэкст і малюнкі.

Дзе жыла чарапаха?
Якога колеру яна была?
Як назвалі яе дзеці?
Якая яна была?
Што любіць чарапаха?
Як паводзіць сябе Жаўтушка ў халоднае надвор'е?

Правообладатель Народная асвета

Падзяліце тэкст на часткі, якія б адпавядалі загалоўкам-пытанням. Перакажыце тэкст па плане і запішыце.

План

1. Дзе жыла чарапаха?
2. Чаму дзеці назвалі яе Жаўтушкай?
3. Што любіць Жаўтушка?
4. Як хаваецца чарапаха ад холаду?

Выкарыстайце словы і словазлучэнні: *пасялілі, жоўтага колеру, рахманая, цёплыя дні, разграбе, схаваецца.*

Памяняйцеся сшыткамі з сябрам па парце.

Праверце пераказ і выкажыце свае заўвагі, прапановы.

Разбор слоў па саставе

44

1. Прачытайце верш. Які настрой перадае паэт? Спішыце. Выдзеленыя словы разбярыце па саставе.

Беларускія краявіды…
Перазвоны азёр і бароў
над **палеткамі**
бульбы і жыта —
песня велічных **курганоў.**

Гэта наша
зямля дарагая,

Правообладатель Народная асвета

гэта нашы
лугі і **палі**,
над якімі
спрадвеку лунае
бусел —
сімвал
бяссмерця
зямлі.

А. Грачанікаў.

Што вы бачыце на малюнках? Адкажыце сказам.

2. Прачытайце. Пазнайце словы па апісанні.

а) корань, як у слова *мядок*, суфікс, як у слова *садовы*, канчатак, як у слова *грыбы*;

б) корань, як у слова *корміць*, суфікс, як у слова *рыбка*, прыстаўка, як у слова *падводны*, канчатак, як у слова *зіма*;

в) корань, як у слова *трактарыст*, суфікс, як у слова *начны*, канчатак, як у слова *двары*;

г) корань, як у слова *браты*, суфікс, як у слова *школьны*, канчатак, як у слова *лугі*.

3. Прачытайце словы. Размяркуйце іх у слупкі ў залежнасці ад таго, якой схеме яны адпавядаюць.

а) б)  в) 

падказка, рыбка, лясны, вада, пасадка, Яўгенавіч, народны, пабелка, марак, каласкі, брацік, машына, прыгоркі, гарадскі, дарога

Правообладатель Народная асвета

Увага! Як вызначыць састаў слова?

Каб вызначыць састаў слова, трэба знайсці і абазначыць:

канчатак — пасадк**а**

аснову — **пасадк**а

корань — па**с**адка

суфікс — пасад**к**а

прыстаўку — **па**садка

4. Выпішыце са слоўніка асобнымі слупкамі па два словы, якія адпавядаюць наступным схемам.

а) б) в)

падбяро́завік краяві́ды збо́жжа вясну́шка

5. Прачытайце словы.

прыгорак, пралескі, грыбнік, пабелка, пагрузка, настольнік, ліса, сарока

Спішыце. Разбярыце словы па саставе.

Знайдзіце ў тлумачальным слоўніку лексічнае значэнне незразумелых вам слоў.

45

1. Прачытайце словы.

баравы, сасновы, ельнік

Складзіце з прыведзенымі словамі некалькі сказаў і запішыце іх. Разбярыце словы па саставе.

Правообладатель Народная асвета

2. Разгледзьце ўважліва «слоўнае» дрэва, коранем якога з'яўляецца слова *лес.* Прывядзіце прыклады слоў з гэтага дрэва, састаў якіх адпавядае наступным схемам:

а) 

б)

в) 

г) 

Запішыце словы.



3. Слова *прыгарадны* азначае **«той, які знаходзіцца каля горада (пры горадзе)»**.

А як сказаць адным словам:

1) той, які знаходзіцца каля дарогі;
2) той, які знаходзіцца каля ракі;
3) той, які знаходзіцца каля возера?

Запішыце ўтвораныя вамі словы. Разбярыце іх па саставе.

4. Запішыце як мага больш слоў, састаў якіх адпавядае схемам.

а)

б) 

Правообладатель Народная асвета

5. Выпішыце з кнігі па чытанні па тры словы, састаў якіх адпавядае схемам.

а)  б)  в)

46

1. Прачытайце загадкі. Адгадайце. Спішыце. Выдзеленыя словы разбярыце па саставе.

1) Маленькі **шарык**
пад лаўкай шарыць,
збірае **крошкі**,
баіцца **кошкі**.

2) **Шустранькі**, **маленькі**,
сам у шэрай світцы,
шукае канапелькі,
каб трохі пажывіцца.

2. Прачытайце словы. Спішыце. Разбярыце словы па саставе.

машыніст, танкіст, лыжнік, струменьчык, вяснушка, туманны, чыгунны, айчынны, дыванчык, узлесак, прыморскі, беражок, замок

Знайдзіце ў тлумачальным слоўніку лексічнае значэнне слова *вяснушка*.

3. Разгледзьце схемы. Запішыце па адным слове, састаў якога адпавядае схемам.

а)  б) в) 

Правообладатель Народная асвета

- Якой схеме адпавядае слова *мышка*?
- Прыдумайце і запішыце з прыведзенымі словамі 1-2 сказы.
- Разбярыце словы па саставе: *пасадка, зоркі, кніжачка*.

4. Прачытайце. Змяніце словы ў дужках, як патрабуе сэнс.

На зернесушылцы

Брыгадзір прапанаваў хлопцам папрацаваць на (*ток*). Міколу паставілі да (*машына*), што перавейвала збожжа. У перапынку ён лёг на (*салома*) і моўчкі стаў глядзець у неба. Раптам Мікола заўважыў, што адна зорка паплыла па (*неба*). Няўжо **зоркі** плаваюць? А можа, гэта **штучны** спадарожнік?

Запішыце тэкст. Выдзеленыя словы разбярыце па саставе.

5. Прачытайце часткі слоў.

бярэж-н-ы-пры-

па-а-буд-ов- лес-уз-ак

ы-н-кніж- ын-а-луж-

- Складзіце з частак слоў цэлыя словы. Запішыце іх.
- Знайдзіце слова з нулявым канчаткам. Абазначце аснову. Складзіце з ім сказ.
- Запішыце новыя словы адпаведна схемам.

Правообладатель Народная асвета

а)

в) 

б)

г)

Складзіце з імі сказы і запішыце.

Што мы ведаем?

1. Разгледзьце схему і назавіце часткі слова.



2. З якіх частак можа складацца слова?

3. Якая частка слова ёсць ва ўсіх словах?

4. Як вызначыць канчатак у слове?

5. Для чаго служыць канчатак у слове?

6. Чым прыстаўка і суфікс падобныя паміж сабой? Чым яны адрозніваюцца?

7. Для чаго служыць прыстаўка? Для чаго служыць суфікс? Прывядзіце прыклады.

8. Якая частка слова аб'ядноўвае прыстаўку, корань і суфікс?

9. Якая частка асновы з'яўляецца абавязковай? Абгрунтуйце свой адказ.

Правообладатель Народная асвета

Правапіс звонкіх і глухіх зычных у корані

47

1. Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс. Запішыце адну прыказку па памяці.

Адклад *не ідзе ў* ***лад.***

Пакуль вочкі — дык свет, пакуль ручкі — дык ***хлеб.***

Адзін ***дуб*** *у полі — то не лес.*

Якія гукі мы чуем на канцы выдзеленых слоў? А якія літары напісаны? Чаму?
Якія вы ведаеце парныя звонкія і глухія зычныя? Запішыце іх.

2. Прачытайце аднакаранёвыя словы. Параўнайце вымаўленне і напісанне выдзеленых зычных.

ястра**б**, ястра**б**кі, ястра**б**ы
слу**п**, слу**п**кі, слу**п**ок
во**з**, ва**з**кі, ва**з**ок
са**д**, са**д**кі, са**д**ок

Як вымаўляюцца выдзеленыя зычныя гукі на канцы слова?
Як яны вымаўляюцца перад глухімі зычнымі гукамі?
А як яны вымаўляюцца перад галоснымі гукамі?

Правообладатель Народная асвета

Напісанне парных звонкіх і глухіх зычных на канцы слоў і перад глухімі зычнымі трэба правяраць.

Для праверкі неабходна змяніць слова або падабраць такое аднакаранёвае слова, каб пасля зычнага быў галосны: *зуб, зубкі — зубок; след, слядкі — слядок.*

3. Прачытайце. Назавіце зычныя ў корані, якія трэба правяраць.

бяроза — бярозка
гаражы — гараж
галубы — голуб — галубкі
палазы — полаз — палазкі

Спішыце. Падкрэсліце зычныя ў корані, якія трэба правяраць.

4. Прачытайце, устаўляючы прапушчаныя зычныя. Звяртайце ўвагу на праверачныя словы. Запішыце. Абазначце корань.

сце.ка — сцяжынка; зага.ка — загадаць; маро. — маразы; кола. — каласы

5. Прачытайце загадкі і адгадайце іх. Знайдзіце ў выдзеленых словах зычныя, якія трэба правяраць, вусна падбярыце праверачнае слова.

1) Туды **рог**, сюды рог,
пасярод — нібы **пірог**,

Правообладатель Народная асвета

а сама напхана пухам
і ў мяне ляжыць пад вухам.

2) Што за **загадка**,
прашу адгадаць:
пад латаю **латка**
і швоў не відаць?

Спішыце. У выдзеленых словах абазначце корань.

48

1. Прачытайце.

Выпаў сне. (*снягі*). Хутка ўдарыць маро. (*маразы*). На рэчцы замерзне лё. (*лядок*). Спіць у берлагу мядзве..ь (*мядзведзі*).

Растлумачце напісанне літар з дапамогай праверачных слоў.

2. Пагутарым. Назавіце звяроў, якія спяць усю зіму. Складзіце з назвамі словазлучэнні і запішыце.

Праверце сябе: **во́жык, барсу́к, мядзве́дзь, су́слік, кажа́н.**

3. Прачытайце. Падбярыце праверачныя словы.

кніжка — кніжачка
ло.ка — ...
лы.ка — ...

сад — сады
сле. — ...
сця. — ...

Правообладатель Народная асвета

блізкі — блізенькі ні.кі — ...
ву.кі — ... сало.кі — ...

Запішыце словы. Устаўце патрэбныя літары. Побач запішыце праверачныя словы.

4. Прачытайце прыказкі. Устаўце патрэбныя зычныя. Абгрунтуйце свой выбар.

Лё $\frac{г}{х}$ *ка сказаць, але ця* $\frac{ж}{ш}$ *ка зрабіць.*

Лы $\frac{ж}{ш}$ *ка дзё* $\frac{г}{х}$ *цю сапсуе ка* $\frac{д}{т}$ *ку мёду.*

Спішыце. Устаўце патрэбныя літары. Растлумачце сэнс прыказак.

5. Прачытайце словы. Устаўце прапушчаныя зычныя. Вусна падбярыце праверачныя словы.

сто., гаро., агаро., атра., ланды., стры., гры., слу., пола., вола., маро., дроз., гора., дож.., гара. .

Запішыце словы. Складзіце (*на выбар*) адзін сказ і запішыце.

49

1. Прачытайце скорагаворку спачатку павольна, а потым хутка. Устаўце прапушчаныя зычныя. Абгрунтуйце свой выбар.

Спраўна стры $\frac{ж}{ш}$ страху стрыжэ, а стрыжыха стру $\frac{ж}{ш}$ кі сцеражэ.

Правообладатель Народная асвета

Спішыце скорагаворку, устаўляючы прапушчаныя літары.

Вывучыце скорагаворку на памяць.

2. Разгадайце рэбусы.

сЗж

Назавіце зычныя ў корані, якія трэба правяраць.

Запішыце словы. Побач напішыце праверачныя словы. Складзіце з імі сказы.

3. Прачытайце загадкі і адгадайце.

1) Сядзяць ба.кі на гра.ках, усе ў ла.ках. 2) Бягуць па даро.цы до.кі ды но.кі. 3) Без рук, без но., а па падлозе скача. 4) Стаіць ляпё.ка на адной но.цы. Хто міма не пройдзе — усякі ёй паклоніцца.

Спішыце. Устаўце прапушчаныя зычныя.

4. Прачытайце верш. Падумайце, якія зычныя трэба ўставіць.

Саладзейшая за мё.

Прывалок мядзве..ь калоду,
зайца ў госці запрашае:
— Пачастую цябе мёдам
і гарачым чаем.

Правообладатель Народная асвета

Адказаў касы з усмешкай:
— Пратапчы ты лепей сце.ку
на прышкольны агаро. .
Морква смачная расце там —
саладзейшая за мё. *Х. Жычка.*

Запішыце верш, устаўляючы патрэбныя літары. Вусна апішыце малюнкі, якія можна было б зрабіць да гэтага верша.

5. Прачытайце сказы. Якія літары трэба ўставіць? Вусна падбярыце праверачныя словы. Запішыце сказы, устаўляючы патрэбныя літары.

На гра.цы расце гаро. . Дзеці пасадзілі абапал дарогі бяро.кі і ду.кі. У лесе дзяўчынкі збіралі яга.кі і гры.кі. Вол вё. вялікі во. . Артысты прыехалі ў наш гора. .

Правапіс прыставак

50

1. Выразна вымавіце словы. Назавіце прыстаўкі.

абдумаць, адмена, надрэзаць, падбяліць, абхапіць, адсылка, падсыпаць, падчысціць

Скажыце, ці аднолькава вымаўляюцца прыстаўкі перад звонкімі і глухімі зычнымі. А ці аднолькава пішуцца?

Спішыце. Абазначце ў словах прыстаўку і корань.

Правообладатель Народная асвета

Прыстаўкі **аб-**, **ад-**, **пад-**, **над-** пішуцца аднолькава і перад звонкімі, і перад глухімі зычнымі: ***аддаць***, ***абхадзіць***.

2. Утварыце аднакаранёвыя словы з прыстаўкамі **ад-**, **аб-**, **над-**, **пад-**. Запішыце словы і абазначце прыстаўкі. Падкрэсліце першую літару кораня.

цягнуць, тачыць, біць

3. Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Хто роднага краю цураецца, той і маткі адцураецца.

Лягчэй адрэзаць, чым надтачыць.

Падсадзі на печ дзядулю — і цябе ўнукі падсадзяць.

Спішыце. Абазначце прыстаўкі.

4. Прачытайце. Дапішыце словы з дапамогай прыставак **ад-**, **аб-**, **пад-**, **над-**.

___кусіць яблык,	___пілаваць сук,
___пісаць пісьмо,	___пісаць адрас,
___несці на пошту,	___званіць знаёмых,
___крэсліць слова,	___месці падлогу

● Разбярыце па саставе слова *падлогу*.

● Складзіце і запішыце сказы з 2 словазлучэннямі (*на выбар*).

● Падбярыце словазлучэнні і складзіце з імі сказы на тэму ***«Я пішу пісьмо»***.

Правообладатель Народная асвета

5. Прачытайце сказы. Спішыце. У выдзеленых словах абазначце прыстаўкі.

Даўно ўжо **абляцелі** лісты з дрэў. **Адцвілі** ў кветніках апошнія асеннія кветкі. Пералётныя птушкі **адляцелі** ў вырай. **Адшумелі** работы ў полі. Хутка прыйдзе зіма.

Пагутарым. Ці чакаеце вы зіму? Чаму?

51

1. Выразна вымавіце словы.

разбег, бязмежны, узлесак, збіць, безбароды, скінуць, усходы, бесклапотны, бяскрайні, раскрыць

Параўнайце, як вымаўляюцца прыстаўкі перад звонкімі і глухімі зычнымі. А як пішуцца?

Спішыце. Абазначце прыстаўкі. Падкрэсліце першую літару кораня.

Перад звонкімі зычнымі пішуцца прыстаўкі **з-, уз-, раз-, без-, бяз-**; перад глухімі — прыстаўкі **с-, ус-, рас-, бес-, бяс-**: ***зрабіць, узлезці, разбіць, безбароды, бязмерны, схіліць, усход, раскрыць, бескарысны, бясхмарны.***

2. Ад дадзеных слоў утварыце новыя (калі гэта магчыма) пры дапамозе прыставак **з-(с-), уз-(ус-), раз-(рас-), без-(бес-), бяз- (бяс-)**.

Правообладатель Народная асвета

везці, воблачны, гучны, квітнець, несці, працоўны, чысціць, лічыць, хмарны, капціць, вярнуць

Запішыце словы. Абазначце прыстаўкі. Падкрэсліце першую літару кораня.

3. Прачытайце скорагаворкі спачатку павольна, а потым хутка. Падбярыце патрэбную прыстаўку. Запішыце. Абазначце прыстаўкі.

Нёс авёс, задраўшы нос, — не данёс, увесь (*раз-*, *рас-*) трос.

Марцін маркі (*раз-*, *рас-*) глядаў,
Максім рамкі (*аб-*) мяраў,
Раман мора маляваў,
Макар час марнаваў,
Марат рыбу лавіў,
Тарас Рыту карміў.

4. Лясныя жыхары рыхтуюцца да зімы. Якія грыбы дастануцца вавёрачцы, а якія — вожыку? Па колькі? Запішыце словы з прыстаўкамі **з-**, **с-**.

Правообладатель Народная асвета

5. Падбярыце і запішыце патрэбныя па сэнсе прыстаўкі (з літарай **з** або **с**).

__даваць макулатуру, __кінуць на машыну, __казаць сябру, __варыць суп, __класці па групах, __дапаможнае гусяня, __карысны чалавек, __мерная радасць, __навіць у памяці

Запішыце словы. Абазначце прыстаўкі.

52

1. Прачытайце сказы. Устаўце прапушчаныя літары. Запішыце.

Дзецям карціць хутчэй а.чыніць скрынку. Жэня не мог ра.вязаць шнурочак. Шафёр па.клаў пад кола вялікі камень. Па.сілкавалася вавёрка і паскакала далей.

Абазначце прыстаўкі ў словах з устаўленымі літарамі.

2. Прачытайце. Запішыце, падзяляючы словы для пераносу па ўзоры. У словах першага слупка абазначце прыстаўку і корань.

саскочыць — са-скочыць
паслухаў — ...
паклікаць — ...

прыйсці — прый-сці
пайсці — ...
зайшоў —...

3. Прачытайце словы.

захварэць, дапамагчы, прыгледзець, падрыхтаваць, заспяшаўся, заварыць

Правообладатель Народная асвета

● Запішыце з падзелам слоў для пераносу.
● Дапішыце 2-3 словы-дзеянні, падзяліце іх для пераносу.
● З выдзеленымі словамі складзіце сказы і запішыце. Якой тэмай можна іх аб'яднаць?

4. Прачытайце словы. Растлумачце падваенне зычных? Назавіце некалькі слоў з падоўжанымі зычнымі.

аддыхацца, раззлавацца, рассыпаць, бясспрэчны, аддаць, аббегчы, рассеяць, бяззбройны

Спішыце, падзяляючы словы для пераносу. Складзіце і запішыце сказ са словам збожжа.

5. Запішыце па два словы з прыстаўкамі **аб-**, **ад-**, **пад-**, **над-**, **уз-**, **рас-**, **з-**, **с-** і падзяліце іх для пераносу.

53

1. Прачытайце словы.

Змесці, аддаць, абтрэсці, схадзіць, зрабіць, адрэзаць, размаляваць, зрэзаць, падбегчы, надтачыць

Спішыце. Абазначце прыстаўкі. Растлумачце іх правапіс.

2. Прачытайце словы. Спішыце. Абазначце прыстаўку і корань.

падхапіў, размачыў, схлусіў, абмеркаваў, знайшоў, узняўся, устаў

Правообладатель Народная асвета

3. Прачытайце. Утварыце новыя словы пры дапамозе прыставак.

касіў, пісаў, сыпаў, бег, біў

Запішыце словы. Абазначце прыстаўку і корань.

4. Прачытайце словы.

Падшываць, **надпісваць**, падстрыгаць, **адправіць, абдумаць**, падцягнуць

- Спішыце, падзяляючы словы для пераносу.
- З выдзеленымі словамі складзіце і запішыце сказы.
- Складзіце і запішыце словазлучэнні па ўзорыы.

Узор: *узлятаць у паветра*.

кінуць — ваду
вітацца — сябрам
класці — канверт

5. Прачытайце. Складзіце сказы. Устаўце патрэбныя прыстаўкі.

Птушкі, у, ...ляцелі, вырай.
Туман, над, ...няўся, ракой.
Вецер, лісты, з, дрэў, ...трос.
Лужы, тонкім, лядком, ...крыліся.
Лёгкі, марозец, ...чуваецца.

Запішыце сказы.

Правообладатель Народная асвета

1. Разгледзьце малюнак і адкажыце на пытанні.

Калі гэта было?
Дзе гулялі дзеці з мячом?
Куды пакаціўся мяч?
Ці ехалі па дарозе машыны?
Што магло б здарыцца з хлопчыкам, які пабег па мяч?
Якую параду далі б вы гэтаму хлопчыку?

Дайце імёны дзецям.

Правообладатель Народная асвета

2. Складзіце звязнае апавяданне, карыстаючыся апорамі.



Дапоўніце сваё апавяданне першым і апошнім сказамі — адказамі на пытанні. (Калі гэта было? Як трэба паводзіць сябе на тратуары?)

Правообладатель Народная асвета

Перакажыце апавяданне два разы.

Запішыце складзенае апавяданне ў сшыткі. Праверце сябе.

Раздзяляльныя знакі апостраф і мяккі знак у словах

55

1. Устаўце замест кропак раздзяляльныя знакі **ь** ці апостраф (’). Запішыце.

Дар.я	Васіл.евіч	л.юць
вераб.і	куп.ё	Ул.яна
л.ецца	пер.е	узгор.е
паштал.ён	б.юць	Мар.я
п.яўка	п.еса	сям.я

2. Дапоўніце сказы. Запішыце.

У нас дружная ... . Стаяла цёплае ... . застаюцца ў нас зімаваць. ... ў вераб’я шэрае. Вучні паставілі цікавую ... .

Выкарыстайце словы: *п’есу, сям’я, вераб’і, пер’е, надвор’е.*

3. Выпішыце ў першы слупок словы з раздзяляльным мяккім знакам, а ў другі слупок словы, у якіх **ь** абазначае мяккасць папярэдняга зычнага.

Ульяна, пісьмо, мільён, дзядзька, рэдзька, паштальён, гальштук, бутэлька, брыльянт, Ва-

Правообладатель Народная асвета

сільеў, Ільюша, бульба, вугалькі, льецца, дзень, восень, пень

4. Прачытайце прыказкі. Устаўце па сэнсе прапушчаныя словы. Запішыце. Падкрэсліце словы з апострафам. Абазначце ў іх прыстаўкі.

Адным ... плота не падапрэш.
Адным ... вузла не завяжаш.
Адным ... не пад'ясі, а ... не нап'ешся.
Адным ... усё поле не аб'едзеш.

Выкарыстайце словы: *кол, палец, гарбузік, расінка, конь.*

5. Устаўце замест кропак мяккі знак ці апостраф. Запішыце.

сузор.е	вераб.і	з.явіўся
пад.ёмны	уз.ехаў	л.юць
пал.ю	надвор.е	пер.е
аб.ява	л.ецца	звяр.ё
п.еса	аб.ём	павіл.ён

Апостраф пасля прыставак

56

1. Прачытайце словы выразна. Спішыце. Абазначце прыстаўкі. Падкрэсліце галосную літару пасля апострафа.

паесці, з'есці, абедзенны, аб'едзены, прыязджаюць, пад'язджаюць

Правообладатель Народная асвета

Як вымаўляюцца словы з апострафам? Калі пасля прыставак пішацца апостраф?

Апостраф пішацца пасля прыставак, якія канчаюцца на зычную, перад літарамі **е, ё, ю, я**: ***з'езд, пад'ём, аб'ява, раз'юшаны***. Пры пераносе апостраф не аддзяляецца ад прыстаўкі: ***аб'-едзены, пад'-язджаюць***.

2. Ад слова *ехаць* утварыце новыя словы пры дапамозе прыставак **з-, пад-, аб-, ад-**. Запішыце. Абазначце прыстаўкі. Растлумачце напісанне апострафа.

3. Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Не раскусіўшы арэх, зерне не з'ясі.
Не папрацуеш — не ***пад'ясі.***
Каб рыбку ***з'есці****, трэба ў ваду лезці.*

Спішыце. У выдзеленых словах абазначце прыстаўкі. Растлумачце напісанне апострафа.

4. Прачытайце словы. Спішыце.

з'ехаць, пад'есці, раз'ясніцца, пад'ём, **раз'юшаны**

- Абазначце прыстаўкі ў словах.
- Словы з апострафам падзяліце для пераносу.
- Знайдзіце ў тлумачальным слоўніку лексічнае значэнне слова *раз'юшаны*. Складзіце з ім сказ і запішыце.

Правообладатель Народная асвета

5. Пагутарым. Як паводзіць сябе раз'юшаны звер? Знайдзіце ў тлумачальным слоўніку значэнне слова «раз'юшаны».

6. Прачытайце сказы. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары або апостраф.

А.тамабіль пад.ехаў да нашага пад.езда. Цягнік на малых раз.ездах не спыня.ся. Ад.езд у нядзелю раніцай.

Калі пішацца апостраф пасля прыставак?

57

1. Прачытайце словы і словазлучэнні. Спішыце, абазначце прыстаўкі. З выдзеленымі словазлучэннямі складзіце сказы і запішыце іх.

аб'ява, аб'ём, аб'езд, з'еў абед, **пад'ёмны кран, з'ехаў з горкі**

Для чаго ўжываецца апостраф? Паміж якімі літарамі ён пішацца?

2. Прачытайце дыялог сяброўак.

— Васілінка! Ты чытала аб'яву?
— Якую?
— Пра паездку на адпачынак у Галандыю.
— Калі ад'езд?
— Ад'езд у суботу а дзясятай гадзіне раніцы. На школьны двор пад'едзе аўтобус.

Правообладатель Народная асвета

Спішыце. Словы з апострафам падзяліце для пераносу.

Прадоўжыце дыялог. Раскажыце, як вы ад'язджаеце на адпачынак.

3. Разгадайце рэбус.

Са словам-разгадкай складзіце і запішыце сказ.

4. Складзіце дыялог пра паездку на возера Нарач. Запішыце. Словы з апострафам падзяліце для пераносу. Для чаго служыць апостраф у слове?

5. Прачытайце загадку і адгадайце яе.

Ён на некалькі хвілінак
аб'яўляе перапынак,
потым кліча на ўрок,
а завецца ён **...** .

Спішыце. Выдзеленае слова падзяліце для пераносу. Абазначце прыстаўку.

6. Прачытайце словы.

пад'езд, без'языкі, уз'ехаць

Складзіце і запішыце сказы. Словы з апострафам падзяліце для пераносу.

Правообладатель Народная асвета

1. Прачытайце. Спішыце. Абазначце прыстаўкі. **58**

Пад'ехаў да гары Тарас.
На горку ўз'ехаў. З'ехаў раз
і заявіў: «Круты пад'ём!
Паедзем у аб'езд — кругом!»

П. Паўлаў.

2. Прачытайце. Замяніце адным словам. Запішыце. Абазначце прыстаўкі.

Паведамленне пра што-небудзь.
Заехаць на высокае месца.
Паказаць білет кантралёру.
Злосна-насмешлівы.

Выкарыстайце словы: *з'едлівы, уз'ехаць, аб'ява, прад'явіць.*

3. Прачытайце аб'яву.

Аб'ява

Заўтра 3-і клас ідзе на экскурсію ў краязнаўчы музей. Збор на школьным двары каля пад'езда а 10-й гадзіне.

Класны кіраўнік.

Складзіце і напішыце аб'яву пра збор макулатуры. Абазначце прыстаўкі.

4. Складзіце і запішыце некалькі сказаў на тэму ***«Навальніца ў дарозе»***.

Правообладатель Народная асвета

Выкарыстайце словы: *раз'юшаны, раз'яснілася, пад'ехалі.*

5. Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Паносіш мазалёў — пад'ясі хлеба.

Сарокі крупы з'елі, а сініца ў клетку папалася.

Адзін з'еш хоць вала — адна хвала, лепей пакрысе, але каб усе.

Спішыце. Абазначце прыстаўкі.

Прыстаўкі і прыназоўнікі

59

1. Прачытайце сказы. Назавіце прыстаўкі і прыназоўнікі. Параўнайце іх.

Параход даплыў да вострава. Хлопчык адплыў ад берага. Міхась збег з гары. Нарэшце дзеці дабраліся да рэчкі.

Правообладатель Народная асвета

Што такое прыназоўнік?
Што такое прыстаўка?
Як пішацца прыназоўнік са словам?
Як пішацца прыстаўка?

Спішыце. Абазначце прыстаўкі, падкрэсліце прыназоўнікі.

Прыстаўкі трэба адрозніваць ад прыназоўнікаў. **Прыстаўка** — частка слова. Яна пішацца разам са словам: ***даплыў, збег, адплыў.***

Прыназоўнік — асобнае слова. Прыназоўнік з іншымі словамі пішацца асобна. Паміж прыназоўнікам і наступным словам можна ўставіць пытанне ці якое-небудзь слова: *даплыў да* (чаго?) *вострава, даплыў да* (*незнаёмага*) *вострава*.

2. Прачытайце выразна верш. Які настрой ён перадае?

Свежы ветрык адхінуў фіранку,
упусціўшы сонейка ў пакой.
І запелі звонка струны ўранку,
нібы ў цымбаліста пад рукой.

П. Макаль.

Спішыце. Падкрэсліце прыназоўнікі, абазначце прыстаўкі.

Правообладатель Народная асвета

Які малюнак вы зрабілі б да верша?

Знайдзіце ў тлумачальным слоўніку лексічнае значэнне слова *фіранка.*

3. Прачытайце словы. Растлумачце іх значэнне.

пра бор, прабор; занос, за нос; улез, у лес

● Спішыце, абазначце прыстаўкі, падкрэсліце прыназоўнікі.

● Складзіце сказы са словамі з прыназоўнікамі. Дакажыце, што гэта прыназоўнікі.

● Растлумачце значэнне слоў *завал, за вал.* Складзіце з імі сказы і запішыце.

4. Прачытайце сказы.

Ноччу бываюць (*за*) маразкі. Удзень (*за*) хмарамі сонейка не ўбачыш. (*Па*) жоўклі дрэвы. (*У*) далёкія краіны (*ад*) лятаюць птушкі. Хутка (*на*) стане зіма.

Спішыце, раскрываючы дужкі. Абазначце прыстаўкі, падкрэсліце прыназоўнікі.

5. Прачытайце. Устаўце прыстаўкі.

..ехаць з горада, ..слаць па ваду, ..йсці ў школу, ..плылі ад берага, ..йшлі да ракі, ..пісаць на дошцы, ..скочыў пад стол, ..цягнуў на сябе

Запішыце. Падкрэсліце прыназоўнікі.

Правообладатель Народная асвета

1. Прачытайце прыказкі. Растлумачце сэнс. **60**

*(**У**) меў (**па**) мыліцца — умей і (**па**) правіцца.*
*Садок (**па**) садзіў — добрую справу (**з**) рабіў.*
*(**З**) кім (**па**) знаешся, такім сам станешся.*

Спішыце, раскрываючы дужкі. Абазначце прыстаўкі. Падкрэсліце прыназоўнікі.

2. Прачытайце загадкі і адгадайце іх. Спішыце, раскрываючы дужкі. Дакажыце, што гэта прыназоўнікі.

1) (*У*) бары (*пад*) хвойкай колкай
вырас беленькі Рыгорка.
Маша (*з*) кошыкам ішла
і Рыгорку знайшла. *Н. Парукаў.*
2) Галавы не мае,
шапку (*на*) назе трымае. *А. Клышка.*

Пагутарым. Раскажыце, як трэба правільна збіраць грыбы.

3. Прачытайце верш выразна. Запішыце, раскрываючы дужкі. Абазначце прыстаўкі, падкрэсліце прыназоўнікі.

Баравічкі сохнуць

Маці, (*пера*) браўшы кошык,
(на) нізала (*на*) кручкі
і (*раз*) весіла (*пры*) гожа
(*над*) плітой баравічкі... *М. Чырык.*

Правообладатель Народная асвета

Як пішацца прыназоўнік са словам?
Як пішацца прыстаўка?

4. Прачытайце словазлучэнні.

(*з*) ляцелі (*з*) дрэў, (*ад*) плылі (*ад*) берага, (*па*) ехалі (*па*) дарозе, (*з*) беглі (*з*) клеткі, (*да*) плылі (*да*) прыстані, (*у*) лезлі (*у*) бочку

Запішыце словазлучэнні, раскрываючы дужкі. Абазначце прыстаўкі. Дакажыце, што гэта прыстаўкі. Падкрэсліце прыназоўнікі. Дакажыце, што гэта прыназоўнікі.

5. Прачытайце. Спішыце, раскрыўшы дужкі. Колькі літар і колькі гукаў у слове *Міхась*?

(*З*) дрэў цесляры (*з*) будуюць дом.
Міхась (*ад*) садзіў (*ад*) кветкі парастак.
Ірынка (*па*) бегла (*па*) сцежцы.

61

1. Прачытайце сказы. Устаўце патрэбныя прыназоўнікі. Выкарыстайце схемы прыназоўнікаў.

У лесе

Мы пайшлі → △ лес. ● △ траве блішчала раса. ● △ дарогі павольна гойдаліся рамонкі. △● сасновым бары пахла смалой. Як прыемна △● лесе!

Запішыце. Абмяняйцеся сшыткамі з сябрам па парце, праверце.

Правообладатель Народная асвета

рамóнак	**гóйдацца**	**запáлка**
рамóнкі	**гóйдаліся**	**запалі́ць**

2. Запішыце па тры словы, састаў якіх адпавядае схемам.

а) 

б)

в) 

г)

3. Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы.

Бусел гняздзіцца каля жылля чалавека у бусла вялізнае гняздо яно складзена з **галінак** дрэў.

Запішыце. Выдзеленае слова разбярыце па саставе.

Вусна апішыце бусла.

4. Прачытайце словы. Складзіце сказы.

сонечны, наступіў, ранак
ласкавае, у, свеціць, сонца, акно
сонцам, яркім, іскрыцца, пад, возера

Запішыце сказы. Абазначце прыстаўкі, падкрэсліце прыназоўнікі.

5. Прачытайце словы. Спішыце. Разбярыце словы па саставе. Складзіце і запішыце два сказы.

прыступкі, пабелка, прыморскі, працоўны, лісточкі

Правообладатель Народная асвета

1. Прачытайце тэкст і адкажыце на пытанні.

Трывожныя сігналы

Прыйшоў Рыгор на раку. Сеў хлопчык каля куста і закінуў вуду. Хутка ён злавіў вялікую плотку. Потым другую. Злоўленую рыбу паклаў у сетачку і апусціў у ваду. Неўзабаве рыбкі пачалі таўчы насамі ў сетку. Рыгор зноў закінуў вуду. Рыба больш не бралася. Пасля хлопчык даведаўся, што плотка пасылала трывожныя сігналы іншым рыбам, каб тыя ўцякалі.

Куды прыйшоў Рыгор?
Што ён рабіў? Каго злавіў хлопчык?
Куды паклаў рыбу Рыгор?
Як пачалі сябе паводзіць рыбкі ў сетцы?
Ці лавілася яшчэ рыба? Чаму?
Падзяліце тэкст на часткі згодна з планам.

План

1. На рэчцы.
2. У сетцы рыба занепакоілася.
3. Трывожныя сігналы.

Перакажыце тэкст. Запішыце пераказ у сшыткі.

Выкарыстайце словы і словазлучэнні: *плотка, неспакойна, неўзабаве, закінуць вуду, злоўленая рыба, трывожныя сігналы, уцякаць ад бяды.*

Правообладатель Народная асвета

1. Складзіце словы. Выкарыстайце часткі слоў з таблі́цы. **63**

Прыстаўка	Корань	Суфікс	Канчатак
прынёс	гарадскі	кніжны	новы
ноч	завочна	рыбка	снягі
прачытаць	вада	лясні́к	коцікі
пранесці	лесавік	рыбка	вада

Запішыце словы. Разбярыце іх па саставе.

2. Прачытайце. Спішыце, абазначце канчатак, аснову, корань, прыстаўку, суфікс.

перапіска, пералётная, прышкольны, пасадка, прыказка

3. Прачытайце. Размяркуйце ў слупкі і запішыце словы, якія адпавядаюць наступнаму саставу.



грыбок, маленькія, сцежачка, шэранькія, зялёныя, сасновыя, лісічкі, пералескі, ляснік, лясы, грыбнікі, палёт, запалка

● Складзіце словазлучэнні са словамі любога слупка (*на выбар*).

Правообладатель Народная асвета

● Дапішыце па адным слове ў кожны слупок.
● Складзіце са словамі любога слупка (*на выбар*) сказы і запішыце іх.

Растлумачце значэнне слова *запалка.*

4. Прачытайце. Устаўце прапушчаныя суфіксы. Запішыце. Вызначце састаў выдзеленых слоў.

Маленькая, квол....ая, а як яна патрэбна людзям! **Тон.ая** запалка ў момант дае людзям агонь. Устойлівы агеньчык трымціць на ветры, але не гасне. **Запалка** — добрая памочніца чалавека.

Пагутарым. Што вы ведаеце пра запалкі? Як трэба імі карыстацца?

5. Прачытайце.

Маразы, стралок, перапіска, выстралы, замаразкі, перавязка, падпіска, перастрэлка, марозны, завязка, запіска, павязка.

Запішыце аднакаранёвыя словы групамі. Разбярыце іх па саставе.

Што мы ведаем?

1. Што такое канчатак? Для чаго ён служыць?

2. Што такое аснова слова?

3. Што такое корань слова?

Правообладатель Народная асвета

4. Якія словы называюцца аднакаранёвымі? Прывядзіце прыклады.

5. Як праверыць напісанне парных звонкіх і глухіх у корані? Прывядзіце прыклады.

6. Што такое прыстаўка? Для чаго яна служыць? Прывядзіце прыклады.

7. Як пішуцца прыстаўкі **аб-, ад-, над-, пад-**?

8. З якой літарай (**з** ці **с**) пішуцца прыстаўкі, калі корань слова пачынаецца звонкім зычным гукам? глухім зычным? Прывядзіце прыклады.

9. Калі пішацца апостраф пасля прыставак? Прывядзіце прыклады.

10. Што такое суфікс? Для чаго ён служыць?

11. Як пішуцца прыназоўнікі са словамі?

ЧАСЦІНЫ МОВЫ

64

1. Прачытайце верш.

Коцік і козлік

Коцік вусаты па садзіку бродзіць,
а козлік рагаты за коцікам ходзіць.
Лапачкай коцік мые свой роцік,
а козлік сівою трасе барадою.

Паводле В. Жукоўскага.

Выпішыце словы, якія адказваюць на пытанні хто? што?, у адзін слупок, словы, якія адказваюць

Правообладатель Народная асвета

на пытанні які? якая? якое?,— у другі, а словы, якія адказваюць на пытанне што робіць?, — у трэці.

2. Разгледзьце малюнкі. Назавіце іх. Падбярыце да іх назвы прымет і дзеянняў.

Запішыце словы ў слупкі.

Узор: *бусел*
даўганогі
ляціць

Праверце сябе: **вавёрка, гадзю́ка, жа́ба, шчупа́к.**

3. Утварыце новыя словы па ўзоры.

дзіва — дзіўны — здзівіць

ноч — ... — ...
шум — ... — ...
смех — ... — ...

Запішыце. Вусна пастаўце да кожнага слова пытанне.

Правообладатель Народная асвета

Сказы складаюцца са слоў.

Усе словы падзяляюцца на часціны мовы.

Словы, якія абазначаюць прадметы і адказваюць на пытанні хто? або што?,— гэта **назоўнікі**: *певень* (хто?), *грэбень* (што?).

Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў і адказваюць на пытанні які? якая? якое? якія?,— гэта **прыметнікі**: *прыгожы* (які?), *прыгожая* (якая?), *прыгожае* (якое?), *прыгожыя* (якія?).

Словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў і адказваюць на пытанні што робіць? што робяць?,— гэта **дзеясловы**: *чытае* (што робіць?), *сустракаюць* (што робяць?).

4. Прачытайце верш.

Бярозка

Яе прынеслі дзеці з гаю
і пасадзілі, каб расла.
Вясёлая і трапяткая,
стаіць бярозка ля сяла.
Гляджу я на яе, дзіўлюся —
і свой благаслаўляю лёс:
я нарадзіўся ў Беларусі
між белых казачных бяроз.

К. Жук.

Правообладатель Народная асвета

Выпішыце словы, якія адказваюць на пытанні:

хто? што? якая?
што робіць? што раблю?

Вусна апішыце малюнкі, якія можна было б зрабіць да верша.

5. Прачытайце прыказкі. Устаўце патрэбныя словы. Растлумачце сэнс прыказак.

Ластаўка дзень пачынае, а ... канчае.
Пяць разоў падумай, а адзін ... .
У сваім лесе і куст ... .

Запішыце. Пастаўце пытанні да ўстаўленых слоў. Якімі часцінамі мовы яны з'яўляюцца?

Выкарыстайце словы: *родны, скажы, салавей.*

Паўтарэнне

1. Прачытайце. Падбярыце да выдзеленых слоў аднакаранёвыя.

чытаць, працаваць, вучыць
чытач, працоўны, вучань, прачытаць
вучаніца, праца, чытанка, вучоба

Запішыце словы групамі. Разбярыце іх па саставе.

Правообладатель Народная асвета

2. Прачытайце верш.

З ценю вылез агурок,
сонейку падставіў бок.
Стаць чырвоным ён хацеў,
ды ад зайздрасці зжаўцеў.

В. Гардзей.

Выпішыце словы з прыстаўкамі. Растлумачце правапіс прыставак.

3. Знайдзіце «чужое» слова сярод «сваякоў» і падкрэсліце яго.

Рачулка, рачны, рак, рака.
Казка, расказваць, каза, казаць.
Весела, вясёлы, вяселле, вясло.
Вітамін, вітанне, вітамінны.
Вада, вадаправод, водар, водны.

У аднакаранёвых словах абазначце корань. Запішыце.

4. Дапішыце канчаткі. Запішыце сказы.

Неб. сёння зацягнулі хмары.
Блакітным неб.. можна любавацца бясконца.
Па неб. і аблоках людзі прадказваюць надвор'е.
Людз. кажуць: «Калі ластаўкі лятаюць нізка, значыць будз. дождж».

Правообладатель Народная асвета

5. Дапішыце канчаткі.

Прыгожая кветк.; сонечн. дзень; напісаць у сшытк.; параіцца з настаўнік..; мець сябр.; пад вялізным дрэв..; піць з крынічк. .

Запішыце.

6. Прачытайце.

(*пры*) ехаць (*з*) горада, (*да*)*ехаць* (*да*) вёскі, (*на*) маляваць (*на*) дошцы, (*па*) йшлі (*па*) дарозе, (*пад*) скочыў (*пад*) столь, (*з*) лез (*з*) дрэва, (*у*) лезці (*у*) ваду

Запішыце словы без дужак. Абазначце прыстаўкі і падкрэсліце прыназоўнікі.

7. Прачытайце тэкст.

Мы павінны беражліва адносіцца да ўсяго жывога на зямлі. Да **травінкі**, да клапа на гэтай травінцы, да непаваротлівага вусеня. Нават да надакучлівага камара і непрывабнага павука.

Помніце! **Карысць** і шкода — у прыродзе паняцці вельмі адносныя.

Спішыце. Растлумачце сэнс апошняга сказа. Колькі літар і колькі гукаў у выдзеленых словах?

Складзіце сказ са словам *карысць*.

Разбярыце па саставе слова *травінкі*.

Правообладатель Народная асвета

8. Прачытайце сказы. Выпраўце памылкі.

Алесь невывучыў урок. У Афрыцы небывае зімы. Дзяцел неўмее спяваць. На бярозе грушы нерастуць.

Запішыце сказы правільна. Падкрэсліце галоўныя члены.

9. У кожным радзе аднакаранёвых слоў абазначце корань. Падкрэсліце слова з іншым коранем.

Лясны — узлесак — лесвіца — ляснік — лес.
Асіна — падасінавік — акунь.
Лавіць — улоў — лава — злавіць — ловы.
Снег — снегавік — негаваркі — сняжок — падснежнік — снежны.

Спішыце.

10. Прачытайце тэкст.

Шлях у космас

Хто з цяперашніх хлопчыкаў і дзяўчынак не марыць стаць касманаўтам? А шлях у космас нялёгкі. Каб паляцець да зорак, трэба многа ведаць. **Неба паважае смелых, настойлівых, здаровых.** Трэба кожны дзень займацца спортам.

Спішыце.

У выдзеленым сказе падкрэсліце галоўныя члены. Вусна пастаўце да іх пытанні.

Правообладатель Народная асвета

Адгадкі

С. 15. Сабака. Сабака.
С. 19. Клубок. Вавёрка.
С. 28. Певень.
С. 39. Грыб. Клубок.
С. 40. Морква.
С. 80. Раса. Крапіва. Свіння.
С. 82. Школа. Кніга. Кніга.
С. 94. Мыш. Верабей.
С. 99. Падушка. Капуста.
С. 101. Капуста. Лыжы. Мяч. Сыраежка.
С. 115. Званок.
С. 120. Баравік. Грыб.

Правообладатель Народная асвета

СЛОЎНІК

Беларусь

абеліск
Белавежская пушча
беларус
касманаўт
першадрукар
плошча Перамогі
прэзідэнт
Хатынь

Гарады Беларусі

Бабруйск
Баранавічы
Брэст
Віцебск
Вілейка
Гомель
Гродна
Салігорск
Жодзіна
Тураў
Магілёў
Мазыр
Мінск
Навагрудак
Нясвіж
Пінск
Полацк

Рэкі і азёры Беларусі

Браслаўскія азёры
Бярэзіна
Вілія
Гарынь
Дзвіна
Дняпро
Нарач
Нёман
Прыпяць
Свіслач
Свіцязь
Сож
Ясельда

Сям'я

бабуля
брат
дачка
дзіця
дзядуля
дзядзька
мама
сын
сястра
унук
унучка
цётка
тата

Месяцы

студзень
люты
сакавік
красавік
май
чэрвень
ліпень
жнівень
верасень
кастрычнік
лістапад
снежань

Правообладатель Народная асвета

ЗМЕСТ

Паўтарэнне 3
Слова 43
Слова як адзінка мовы . . . . . —
Лексічнае значэнне слова 46
Прамое і пераноснае значэнне слова . . . 49
Словы, блізкія па значэнні. Словы з супрацьлеглым значэннем 52
Састаў слова. Канчатак слова 58
Аснова слова 65
Корань слова 70
Прыстаўка 76
Суфікс 83
Разбор слоў па саставе 90
Правапіс звонкіх і глухіх зычных у корані 97
Правапіс прыставак 102
Раздзяляльныя знакі апостраф і мяккі знак у словах 111
Апостраф пасля прыставак 112
Прыстаўкі і прыназоўнікі 117
Часціны мовы 126
Паўтарэнне 129
Адгадкі 133
Слоўнік 134

Правообладатель Народная асвета

(Назва і нумар школы)

Вучэбны год	Імя і прозвішча вучня	Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні	Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			

Вучэбнае выданне

Альфер Маргарыта Віктараўна
Сафонава Ала Пятроўна

Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для 3 класа спецыяльных агульнаадукацыйных школ з беларускай мовай навучання

У 2 частках

Частка 1

2-е выданне, перапрацаванае

Заг. рэдакцыі *В. Г. Бехціна*. Рэдактар *Т. У. Люковіч*. Мастакі *С. І. Ржавуцкая, Э. Э. Жакевіч, В. Р. Мішчанка, Н. Л. Клімава*. Мастацкі рэдактар *Л. І. Мялоў*. Тэхнічны рэдактар *Г. А. Дудко*. Карэктары *Г. В. Алешка, В. С. Бабеня, Д. Р. Лосік, Т. М. Вядзернікава*.

Падпісана ў друк 18.03.2011. Фармат $70 \times 90^1/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура школьная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 9,95. Ул.-выд. арк. 4,5. Тыраж 824 экз. Заказ .

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494083 ад 03.02.2009.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку».
ЛП № 02330/0494156 ад 03.04.2009.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Правообладатель Народная асвета